

ДВА ТЫДНІ САМАІЗАЛЯЦЫІ

2

ПАМІЖ ПРЫВАТНАСЦЮ І АДКАЗНАСЦЮ

МС




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 САКАВІКА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 60 (29174)


9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ГРАКУН, намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«У нас сёння дастатковая колькасць збожжавых для таго, каб забяспечыць краіну мукамольна-крупяной прадукцыяй. Па ячных, аўсяных крупах у нас ёсць лішкі. Што датычыцца грэчкі, сёння на камбінатах хлебапрадуктаў ёсць запасы саміх круп і сыравіны для іх вытворчасці на пяць месяцаў. Да новага ўраджаю нам гэтага дастаткова. Сёння ў магазінах грэчка ёсць».*

# У народным стылі



Калектыў ашмянскіх самадзейных майстроў змяніў вясковую прапіску на гарадскую — у раённым цэнтры хутка адкрыецца аддзяленне рамёстваў і традыцыйнай культуры. У кароткія тэрміны рукадзельніцам неабходна афарміць новае памяшканне і выставіць найлепшыя творы, каб паказаць самабытнасць Ашмяншчыны.

— Сямнаццаць гадоў мы працавалі на базе Палянскага дома культуры, займаліся адраджэннем мясцовых рамёстваў і асвойвалі больш сучасныя віды народнай творчасці. Цяпер будзем далучаць да вытокаў народнай культуры і жыхароў горада, асабліва дзяцей і моладзь, — кажа вядомы на Гродзеншчыне майстар па аплікацыі і пляценні з саломы загадчыца аддзялення Валянціна СВІРСКАЯ.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Валянціна СВІРСКАЯ *(справа)* і малады спецыяліст установы Кацярына СЯЧКО абмяркоўваюць дызайн аўдыторыі, дзе будуць праходзіць адкрытыя майстар-класы.**

КОРАТКА

- **Міністэрства аховы здароўя: у большасці пацыентаў з COVID-19 хвароба працякае лёгка ці бессімптомна.**
- Беларуская гандлёва-прамысловая палата вызначыла, якія акалічнасці з'яўляюцца форс-мажорам.
- **«Тэхнабанк» прыпыніў выплаты па чэках Tax Free.**
- У Расіі дазволілі ўязджаць замежнікам, якія з'яўляюцца блізкімі сваякамі расіян.
- **Вялікі тэатр Беларусі падоўжыць сезон да ліпеня, «Балетнае лета» адмяняецца.**
- У Еўропе з-за каранцінных мер пад пагрозай апынуўся збор ураджаю.
- **Дэпартамент па авіяцыі Мінтранса прапрацоўвае пытанне захавання авіязносін з Расіяй.**
- Прыём заявак на Нацыянальную прэмію ў галіне выяўленчага мастацтва прадоўжаны да 16 красавіка.

Hi-tech

## ЯКІМ БЫЦЬ «РАЗУМНАМУ» ГОРАДУ?

**У Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Беларусі да 2035 года вялікая ўвага ўдзяляецца мадэлі эканомікі будучыні. Яе краевугольным каменем вызначана лічбавізацыя. Плануецца, што інфармацыйныя тэхналогіі новага пакалення пранікнуць ва ўсе без выключэння сферы грамадскага жыцця.**

Адзін з іх складнікаў — канцэпцыя «разумны горад» — максімальна зручны для жыцця яго насельнікаў. Інфармацыя з соцень тысяч апаратаў паступае ў адзіны «электронны мозг». Як вынік — кожны жыхар мегаполіса атрымлівае шмат карысных магчымасцяў.

Напрыклад, «разумныя» тэхналогіі неўзабаве з'явяцца на самай загружанай аўтадарозе Беларусі — Мінскай кальцавой. **Начальнік аддзела арганізацыі дарожнага руху і дарожнай інспекцыі УДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Дзмітрый НАВОЙ** зазначыў, што дзякуючы гэтаму ўдасца панізіць колькасць дарожна-транспартных здарэнняў і, адпаведна, лік іх ахвяр. Але як жа гэта працуе?

СТАР. 5

Прырода і мы

## Надвор'е стала менш прадказальнае

Спецыялісты не жартуюць: клімат і напраўду мяняецца



pogoda.by

**У Беларусі павялічылася сярэднегадавая тэмпература, як і на ўсім зямным шары. Пра гэта расказала намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана КУЗЬМІЧ.**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Вы яшчэ паспяваеце падпісацца на «Звязду» на II квартал

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Ва ўрадзе

# ДВА ТЫДНІ САМАІЗАЛЯЦЫІ

**Саўмін вызначыў меры па прадухіленні завозу і распаўсюджвання інфекцыі, выкліканай каранавірусам COVID-19.**

У прыватнасці, пастанова абавязвае асоб, якія прыбылі ў Беларусь з краін, дзе рэгіструюцца выпадкі інфекцыі COVID-19, на працягу 14 каляндарных дзён з дня прыбыцця ў Беларусь знаходзіцца ў самаізаляцыі ў хатніх умовах. Такія асобы не падлягаюць наступнаму пропуску праз дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь (да заканчэння тэрміну самаізаляцыі), паведамляе прэс-служба Савета Міністраў.

Дадзеныя дзеянні не распаўсюджваюцца на супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў, консульскіх устаноў замежных дзяржаў у Беларусі і акрэдытаваных па сумяшчальніцтве з рэзідэнцыяй у іншых краінах, міжнародных арганізацый і іх прадстаўніцтваў, размешчаных на тэрыторыі Беларусі, а таксама членаў іх сем'яў; кіраўнікоў і членаў афіцыйных дэлегацый; кіроўцаў транспартных сродкаў пры выкананні міжнародных аўтамабільных перавозак грузаў; членаў экіпажаў паветраных суднаў, суднаў унутранага воднага транспарту, цягніковых брыгад, лакаматыўных брыгад міжнароднага чыгуначнага паведамлення; замежнікаў, якія ідуць транзітам праз тэрыторыю Беларусі для вяртання да месца жыхарства.

Супрацоўнікі органаў памежнай службы выдаюць асобам, якія прыбылі, адмысловую анкету. Пасля запаўнення яна перадаецца службовым асобам Міністэрства аховы здароўя.

Кіроўцы, якія выконваюць транзітныя аўтамабільныя перавозкі грузаў праз Беларусь, паміж двума пунктамі перасячэння дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь у месцах, устаноўленых заканадаўствам, абавязаны праязджаць толькі па рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах, на якіх магчымы прыпынак для адпачынку і харчавання кіроўцаў, запраўкі транспартных сродкаў.

Кіроўцы, якія выконваюць транзітныя перавозкі, абавязаны пакінуць тэрыторыю Беларусі па найкарацейшым маршруце не пазней за дзень, які ідзе за днём уезду на яе тэрыторыю, за выключэннем выпадкаў, калі немагчымасць выканання названага тэрміну абумоўлена аварыяй (паломкай) транспартнага сродку, а таксама разгрузкай, перагрузкай (перавалкай) грузу, заменай транспартнага сродку, калі гэта прадугледжана умовамі дагавора аўтамабільнай перавозкі і паказана ў транспартных дакументах.

У перыяд спынення кіроўцы, якія выконваюць транзітныя перавозкі, не павінны пакідаць тэрыторыю пунктаў прыпынку.

Міністэрству аховы здароўя сумесна з аблвыканкамамі даручана арганізаваць кантроль за правядзеннем санітарна-супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў у пунктах прыпынку (стаянкі) для адпачынку і харчавання кіроўцаў, запраўкі транспартных сродкаў згодна з пералікам дарог і спецыялізаваных месцаў.

Аблвыканкамам сумесна з Беларускім дзяржаўным канцэрнам па нафце і хіміі даручана прыняць неабходныя меры па забеспячэнні персаналу, які ажыццяўляе свае функцыі ў пунктах прыпынку (стаянкі) для адпачынку і харчавання кіроўцаў, запраўкі транспартных сродкаў, указаных у пераліку дарог і спецыялізаваных месцаў, сродкамі індывідуальнай абароны (медыцынскія маскі, пальчаткі) і забяспечыць кантроль выканання рэкамендацый Міністэрства аховы здароўя.

За невыкананне патрабаванняў гэтай пастановы асобы, якія прыбылі, а таксама кіроўцы, якія выконваюць транзітныя перавозкі, нясуць адказнасць, прадугледжаную заканадаўствам.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Медыяпрастора

# НОВЫ МЕРЫДЫЯН УЗАЕМАДЗЕЯННЯ

## БСЖ і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў заснавалі парламенцкі клуб

**Статутныя дакументы аб стварэнні дарадча-кансультацыйнага органа пры Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах «Парламенцкі мерыдыян» падпісалі ў чацвер у Доме прэсы.**

Адкрыты парламенцкі клуб «Парламенцкі мерыдыян» — дыскусійная пляцоўка ўзаемадзеяння дэпутацкага корпуса і экспертнай супольнасці краіны, якая дапаможа пашырыць кантакты парламентарыяў і масмедыя.

«На мой погляд, нам вельмі важна вызначыцца з асноўнымі паняццямі і асноўнымі сэнсамі, а менавіта: якое грамадства мы ствараем, па якіх мадэлях і кірунках будзе развівацца наша Рэспубліка Беларусь, з якімі праблемамі і выклікамі мы можам сутыкацца на гэтым шляху, — расказаў аб перадумовах стварэння супольнасці **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ.** — Нам неабходна пляцоўка, на якой мы зможам гэта свабодна абмяркоўваць. Дзе як не праз парламенцкія структуры і з удзелам парламентарыяў мы павінны гаварыць пра будучыню нашай краіны?»

Клуб будзе адкрыты для прадстаўнікоў дэпутацкага корпуса, журналістаў і экспертаў. Плануюць прыцягваць супрацоўнікаў буйных рэдакцый абласцей і раёнаў.

Як дадаў Андрэй Савіных, «Парламенцкі мерыдыян» павінен аб'ядноўваць людзей, якія гатовы спрачацца, абмяркоўваць складаныя пытанні для выпрацоўкі агульнага меркавання дзеля развіцця нашай краіны. Яшчэ адна задача клуба — сфарміраваць і палепшыць палітычную культуру дыскусій.

Па словах **старшыні праўлення «Беларускага саюза журналістаў» Андрэя КРЫВАШЭЕВА,** клуб — першае для аб'яднання парламенцкае вымярэнне ў рабоце.

«У саюзе журналістаў шмат членаў-практыкаў, для якіх прынцыпова важна разумець, у якіх кірунках рухаецца і развіваецца беларуская дыпламатыя, у прыватнасці беларуская парламенцкая дыпламатыя і беларуская палітыка як стратэгічныя. Па сутнасці, для практыкуючых журналістаў гэта інсайд, — адзначыў Андрэй Крывашэеў. — Мы разлічваем стаць мостам паміж дэпутатамі і нашымі гледачамі, слухачамі, то-бок грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, каб эфектыўна даносіць іх запыты да нашых парламентарыяў».

У рабоце клуба для прэсы прадугледжаны абмеркаванні: як адкрытыя, так і закрытыя, у фармаце чатэм-хаус (размовы па аснове ананімнасці).

Першае пасяджэнне клуба запланавана на пачатак лета. Сярод асноўных тэм будучых сустрэч — паняцце лібералізму, сутнасць сацыяльнай дзяржавы, інтэграцыйныя намеры нашай краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кітай прыме меры для стабілізацыі сусветнай эканомікі падчас пандэміі

Пра гэта на экстранным саміце лідараў «Вялікай дваццаткі» ў фармаце відэаканферэнцыі заявіў старшыня КНР Сі Цзіньпін, паведамляе ТАСС. Кітай заклікае краіны G20 прыняць меры для захавання глабальных вытворчых ланцужкоў. «Эпідэмія нанесла сур'ёзны ўдар па глабальнай вытворчасці і попыце. Усе краіны павінны разам праводзіць макрапалітыку для таго, каб стварыць імпульс і спыніць запаволенне сусветнай эканомікі», — падкрэсліў кіраўнік КНР. Сі Цзіньпін адзначыў, што Кітай стварыў адкрытую для ўсяго свету інтэрнэт-платформу з інфармацыяй аб COVID-19. «Вірус не мае меж, эпідэмія з'яўляецца нашым агульным ворагам. Усе краіны павінны працаваць поплеч, каб стварыць трывалую ахоўную анлайн-сетку», — заўважыў старшыня КНР.

### Іспанія абышла КНР па колькасці смерцяў ад каранавіруса



Эпідэмія COVID-19 распаўсюджваецца ў Іспаніі хутчэй і шырэй, чым у Італіі, і сітуацыя тут становіцца значна горшая. Гэтая краіна апярэдзіла Кітай па колькасці памерлых ад каранавіруса. У адрозненне ад Італіі, дзе 80 % хворых гіне ў трох найбольш праблемных з пункту гледжання эпідэміялогіі рэгіёнах (Ламбардыя, Эмілія-Раманья і Венета), у Іспаніі інфекцыя цяпер актыўна распаўсюджваецца па аўтаномных супольнасцях, у якіх раней не фіксавалася. Сярод іх — Каталонія, Кастылія і Леон, Кастылія-Ла-Манча, Валенсія. «Мы ўсё яшчэ знаходзімся ў стадыі росту ўздзеяння віруса», — заявіў кіраўнік Эпідэміялагічнага таварыства Іспаніі (SEE) Пера Гадой. Эпіцэнтрам эпідэміі застаюцца аўтаномная супольнасць Мадрыд і сама сталіца краіны. Паводле асобных ацэнак, там могуць заразіцца каранавірусам да 80 % жыхароў.

### ЗША заклікалі Саудаўскую Аравію супакоіць нафтавы рынак

Злучаныя Штаты прама ўмяшаліся ў цэнавую вайну паміж Саудаўскай Аравіяй і Расіяй, заклікаўшы Эр-Рыяд супакоіць энергетычныя і фінансавыя рынкі ў перыяд эканамічнай нявызначанасці, піша Bloomberg. Дзяржсакратар ЗША Майк Пампеа пагаварыў з наследным прынцам каралеўства Мухамедам ібн Салманам. Згодна з заявай Дзярждэпартамента, Пампеа падкрэсліў, што Саудаўская Аравія мае рэальную магчымасць супакоіць сусветныя энергетычныя і фінансавыя рынкі ва ўмовах сур'ёзнай эканамічнай нявызначанасці. Пазіцыя ЗША заключаецца ў тым, што лішак нафты пагаршае фінансавыя прагнозы, таму Вашынгтон хоча, каб усе краіны працавалі разам над вырашэннем праблемы, піша Bloomberg.

Парламенцкі дзённік

# Праекты для ўстойлівасці

## Падрыхтоўка рэспубліканскага бюджэту на 2021 год пачнецца ў найбліжэйшы час

**Аб гэтым паведаміў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на пасяджэнні Савета палаты. Спікер падкрэсліў, што праблемы і ініцыятывы належыць абмяркоўваць у тым ліку і на месцах, з кіраўніцтвам выканкамаў і прадпрыемстваў.**

Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, напярэдадні другой сесіі дэпутаты працуюць актыўна.

Прынамсі, 36 законапраектаў з 64 ужо падрыхтавана да разгляду на найбліжэйшых пасяджэннях вясенняй сесіі.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў лічыць неабходным удзяліць асаблівую ўвагу праектам законаў па пытаннях гаспадарчых таварыстваў, гандлю і грамадскага харчавання, рэкламы, аховы здароўя — менавіта яны больш за ўсё абмяркоўваюцца ў грамадстве. Да працы над гэтымі законапраектамі прыцягваюцца эксперты, прадстаўнікі бізнесу, грамадскіх аб'яднанняў, грамадзяне.

### Вірусная інфекцыя не паўплывае на якасць распрацоўкі законаў

**У гэтым запэўніў журналістаў старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ.**

«Мы рэальныя людзі, працуем у рэальнай сітуацыі. Канешне, эпідэмія каранавіруса робіць пэўны ўплыў і на нашу працу. У прыватнасці, прынята рашэнне не праводзіць вялікіх масавых мерапрыемстваў. У любым выпадку мы робім усё, каб эпідэмія ніякім чынам не паўплывала на якасць нашай бягучай працы і заканатворчай дзейнасці», — канстатаваў дэпутат.

Нягледзячы на тое што распаўсюджанне каранавіруснай інфекцыі прытармазіла развіццё міжнароднай дзейнасці і планы давялося адкласці на больш позні тэрмін, дэпутаты здолеюць кампенсаваць затрымкі, падкрэсліў Андрэй Савіных.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Блізкая ўлада

## ЗВАНКІ ПА РАСКЛАДЗЕ

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, **28 сакавіка,** з 9.00 да 12.00 праводзяць:

- старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль Васілевіч ЛІС. Тэл. 8 016 221 31 21;
- старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСНЁЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Ірына Анатолеўна РАІНЧЫК. Тэл. 8 022 250 18 69;
- старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр Генрыхавіч ТУРЧЫН. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання Бараніку Васілію Міхайлавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

На слыху

# Тэсты пакуль выключна адмоўныя

**У прафілактычнай барацьбе з каранавірусам актыўны ўдзел бяруць прадпрыемствы, арганізацыі і санэпідслужба Магілёўскай вобласці.**

У рэжыме нон-стоп працуюць у гэтыя дні магілёўскія вірусолагі, якія праводзяць тэсты на наяўнасць каранавіруса. За суткі яны правяраюць 300—400 проб з Магілёўскай і Віцебскай абласцей.

— Хоць рэальна тыя два ПЦР-комплексы, якія ёсць у нас на ўзбраенні, могуць апрацаваць за суткі 130—150 проб, — кажа **загадчыца лабараторнага аддзела Магілёўскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Раіса БОЛСУН.** — Іншымі словамі, на працягу чатырох з паловай гадзін можна даведацца вынік толькі па 66 тэстах, а іх у разы больш. Але мы спраўляемся. Аддзел перайшоў на кругласутачную работу, задзейнічаны ўвесь урачэбны і сярэдні персанал лабараторыі. Нашы вірусолагі працуюць на мяжы сваіх магчымасцяў. Хочацца, каб і людзі ставіліся да нас з паразуменнем і не прыспешвалі з вынікамі.

Тэсты на каранавірус Магілёўскі абласны цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя праводзіць з 21 сакавіка, і, па словах загадчыцы лабараторнага аддзела, яшчэ ніводны тэст на наяўнасць гэтага небяспечнага віруса не пацвердзіўся.

Між тым два буйныя прадпрыемствы вобласці сёння працуюць на забеспячэнне ўнутранага рынку медыцынскімі маскамі.

— За два месяцы мы зрабілі каля 700 тысяч адзінак гэтай прадукцыі, — паведаміла **намеснік генеральнага дырэктара па продажы ААТ «Стужка» Інеса СЦЯПАНЧЫКАВА.** — Гэта чатырохслойныя павязкі шматразовага выкарыстання — пахадзіў у масцы, памыў, папрасаваў і зноў карыстайся. На рынак мы іх пастаўляем праз крамы «Медтэхнік», «Фармацыі» і сеткі камерцыйных аптэк.

Бабруйскае прадпрыемства «Славянка» — буйны вытворца адзення для дзяцей і дарослых — сёння таксама вырабляе ў суткі 150 тысяч марлевых масак. Як растлумачылі на прадпрыемстве, вырабляць гэтыя сродкі гігіены тут пачалі яшчэ ў пачатку лютага. І попыт расце.

Новы антысептык распрацаваў Бабруйскі завод біятэхналогій. Ліцэнзію на выраб антысептычнай прадукцыі завод атрымаў яшчэ некалькі гадоў таму, але попыт на яе вырас менавіта ў сувязі з каранавірусам. З сакавіка лінія працуе на поўную магутнасць, сёння на ўнутраны рынак краіны кожныя суткі выпускаецца 8 тысяч літраў антысептыка «Чыстыя ручкі».

— Заказваюць у асноўным арганізацыі, частку рэалізуем праз сваю гандлёвую сетку, — паведаміў **намеснік дырэктара па інавацыйнай дзейнасці Уладзімір МАЦЮШЭЎСКІ.** — Гель на 65 % складаецца са спірту. Гэтага дастаткова, каб змагацца са шкодным вірусам.

У Магілёве і Бабруйску таксама арганізавана работа гарачых ліній па пытаннях прафілактыкі каранавіруснай інфекцыі — 8 (0225) 71-58-31, 8 (0222) 63-53-60 (кругласутачна), 8 (0222) 33-18-68 (штодня з 8.00 да 18.00). Працуюць, акрамя таго, гарачыя лініі цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і БРСМ.

Медыкі і эпідэміёлагі заклікаюць абмяжоўваць наведванне месцаў масавага збору людзей (грамадскі транспарт, крамы, аптэкі і гэтак далей), асабліва ў гадзіны пік — з 7.30 да 9.00 і з 17.00 да 18.30.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# Шкадаванне, разгубленасць і радасць

## Як спартсмены адрэагавалі на перанос Алімпійскіх гульняў

**Алімпійскія гульні ў Токіа пераносяцца на наступны год — такое рашэнне прынята Міжнародным алімпійскім камітэтам па ўзгадненні з аргкамітэтам «Токіа-2020» і ўрадам Японіі па прычыне распаўсюджвання ў свеце каранавіруса COVID-19. Эстафета алімпійскага агню ў сувязі з пераносам летніх Гульняў XXXII Алімпіяды адменена, пра новую дату яе старту будзе паведамлена дадаткова. Летнія Гульні XXXII Алімпіяды і Паралімпійскія гульні захаваюць назву «Токіа-2020».**

Паводле афіцыйнай інфармацыі, перанесеныя Гульні павінны прайсці не пазней за лета 2021 года, аднак дакладныя даты пакуль не называюцца. «Мы павінны разам паглядзець, якія ёсць варыянты. Пасля кансультацый з федэрацыямі мы таксама павінны будзем улічыць змяненні ў спартыўным календары і мноства іншых пытанняў, — пракаментаваў сітуацыю **Прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта Томас БАХ.** — Мы павінны прыйсці да рашэння як мага хутчэй, але прыярытэтам павінна быць якасць рашэння, каб сапраўды ўлічваць інтарэсы ўсіх уцягнутых бакоў. Перанос Алімпійскіх гульняў — гэта велізарная галаваломка. Калі вы прыбераце адну частку, то ўвесь пазл разбурыцца. Усе ўдзельнікі павінны будуць пайсці на ахвяры і кампрамісы, каб забяспечыць поспех Токіа-2020».

Самыя відавочныя даты — вясна і лета 2021 года, але, што б ні абраў Міжнародны алімпійскі камітэт, гэта моцна паўплывае на наступны спартыўны каляндар. Бо 2021 год і так вельмі насычаны: напрыклад, летам гэтага года павінен прайсці чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы — трэцяя па значнасці падзея ў сусветным спорце пасля летніх Алімпійскіх гульняў і футбольнага чэмпіянату свету. Плюс чэмпіянат свету па водных відах спорту. Гэтыя два мерапрыемствы ідуць адно за адным — якраз у ліпені і жніўні, да іх дадаецца тэнісны Уімблдон. Калі ж ссоўваць гэтыя сусветныя чэмпіянаты на год, пацерпяць кантынентальныя турніры, якія павінны прайсці ў 2022 годзе.

Пакуль спартыўныя чыноўнікі думаюць над гэтай няпростай задачай, спартсмены і тыя, хто адносіцца да гэтай сферы, выказалі першыя каментарыі з нагоды пераносу Алімпіяды ў сваіх сацыяльных сетках і журналістам.

**Уладзімір НЕСЦЯРОВІЧ, прэс-сакратар Міністэрства спорту і турызму Беларусі:**

— Гэтая сумесная заява Міжнароднага алімпійскага камітэта і аргкамітэта па правядзенні Алімпійскіх гульняў у Токіа выклікала ў нас, з аднаго боку, шкадаванне, з другога — разуменне, чым такое рашэнне выклікана. Шкадаванне — таму што беларускія атлеты сапраўды гэтак жа, як і атлеты ўсяго свету старанна, настойліва і ўпарта рыхтаваліся да гэтых Алімпійскіх гульняў. А разуменне — таму што занадта вялікая рызыка, што спартсмены, члены дэлегацый і гледачы падвяргаюцца сур'ёзнай небяспецы, звязанай з заражэннем каранавірусам.

**Уладзімір САМСОНАЎ, экс-першая ракетка свету, шасціразовы чэмпіён Еўропы па настольным тэнісе:**

— Я разлічваў завяваць ліцэнзію ў Токіа, бо зусім нядаўна быў у даволі добрай форме, але і да рашэння перанесці Гульні я таксама быў гатовы. Сітуацыя цяпер зусім няпростая, у многіх спартсменаў няма магчымасці для трэніровак і невядома, што будзе далей. Арганізатары і МАК павінны ў першую чаргу думаць пра здароўе спартсменаў і ўсіх, хто будзе звязаны з Алімпійскімі гульнямі. Вядома, нельга сказаць, што час працуе на мяне, але пакуль я не думаю заканчваць кар'еру. З-за пераносу ў мяне будзе больш часу падрыхтавацца і да адборачных турніраў, і да саміх Алімпійскіх гульняў.

**Анастасія МІРОНЧЫК-ІВАНОВА, бронзавы прызёр чэмпіянату свету, шматразовая чэмпіёнка Беларусі па скачках у даўжыню:**

— Можа быць, гэта да лепшага. Так, напэўна, правільна, каб падрыхтавацца, выключыць усе памылкі. І самае галоўнае — каб усе людзі былі здаровыя, і гэта спыніла жудасны вірус. Мы працягваем працаваць яшчэ лепш і больш якасна. Я гатова спаборнічаць заўсёды, у любы час і пры любых умовах!

***Андрэй АРАМНАЎ, алімпійскі чэмпіён і чэмпіён свету ў цяжкай атлетыцы:***

— Для мяне гэта выдатная навіна, таму што напярэдадні я атрымаў дастаткова сур'ёзную траўму — надрыў локцевай звязкі. На фоне хвалявання, нерваў і перагрузкі дапусціў памылку, таму спадзяваўся, што сур'ёзных стартаў сёлета ўжо не будзе. У мяне з'явяцца шанц выдатна падрыхтавацца. Але для сусветнага спорту і асабліва спартсменаў, якія знаходзіліся ў добрай форме, гэта моцны ўдар. Узроставыя спартсмены адсеюцца, а моладзь падцягнецца. Але перанос Алімпійскіх гульняў, на мой погляд, — правільнае рашэнне: не трэба баяцца каранавіруса і панікаваць, але сітуацыя ў свеце вельмі сур'ёзная, зямля сутыкнулася з рэальнай праблемай.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Будзь у курсе!

## Канікулы ў рэжыме анлайн-праекта

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя 30 сакавіка даюць старт сумеснаму анлайн-праекту «Клёвыя канікулы».**

Саюз моладзі і піянерская арганізацыя заклікаюць школьнікаў паменш наведваць грамадскія месцы, а правесці канікулы не выходзячы з дому, але цікава і карысна выконваючы розныя заданні анлайн. Праект складаецца з шэрагу штодзённых заданняў па тэматыках.

Да ўдзелу запрашаюцца школьнікі рознага ўзросту. На афіцыйных пляцоўках БРСМ і БРПА ў «УКантакце» і «Інстаграм» 30 сакавіка будзе апублікаваны чэк-ліст праекта з заданнямі. А каб іх было цікава выконваць, да кожнага падрыхтаваны пашыраны лайфхак. Калі, напрыклад, тэматыкай дня стане «Сямейны кінапрагляд», то дзецям будзе прапанаваны пералік мастацкіх кінастужак, якія цікава будзе глядзець усёй сям'ёй і яны гарантавана спадабаюцца юным кінаманам. Калі ж, напрыклад, гэта будзе «Дзень любімых гульняў», школьнікаў пазнаёмяць з самымі папулярнымі гульнямі для дзяцей і падлеткаў. У праекце знойдуць месца і карысныя кампаненты, напрыклад прыбіранне свайго пакоя. А праверыць хатняе заданне дапаможа хэштэг #клевыеканикулы.

Вынікам праведзенай школьнікамі работы стануць фота з месца падзеі пад аднайменным хэштэгам #клевыеканикулы, якія ўдзельнікі анлайн-праекта штодня будуць выкладаць у сваіх пабліках у сацсетках. Найлепшыя з іх будуць адзначаны прызамі Саюза моладзі і піянерскай арганізацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

# Няўтульная вясна

## У панядзелак з поўначы Еўропы да нас завітае халодны парывісты вецер

**Сёлета вясна нас не песціць стабільнасцю. Выгляне сонца — хоць загарай, зацягне неба хмарамі — вось вам і дождж з мокрым снегам. А якія кантрасныя тэмпературныя амплітуды на працягу сутак, яны дасягаюць 20 градусаў! Напрыклад, у ноч на сераду ў сталіцы было да мінус 8 градусаў, а ўдзень — ужо плюс 9 градусаў. Вось і ў суботу спачатку прыгрэе, а потым у панядзелак падмарозіць, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу надвор'е ў краіне працягне фарміраваць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Чакаецца пераменная воблачнасць, без ападкаў. Вецер будзе ўсходні, паўднёва-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 3 градусаў да плюс 4 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да 11—17 цяпла.

Але камфортным надвор'е будзе нядоўга. З нядзелі яно пачне мяняцца. Атмасферны ціск будзе падаць, уладу над надвор'ем у дзённыя гадзіны возьме атмасферны фронт, воблачнасць. Уначы яшчэ будзе без ападкаў, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, які будзе пераходзіць у мокры снег. Уначы і раніцай месцамі — слабы туман. Паўднёва-заходні вецер зменіцца на паўночна-заходні, уначы будзе слабы, а ўдзень парывісты. Уначы тэмпература паветра складзе ад нуля да плюс 5 градусаў. Удзень — ад 3 цяпла па паўночным захадзе да плюс 16 градусаў па паўднёвым усходзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня ўмовы надвор'я вызначацыць усё тая ж няўстойлівая паветраная маса, якая паступае з паўночнага захаду Еўропы. Уначы тэмпература паветра будзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла, днём — ад нуля да плюс 7 градусаў. Адчуванне холаду ўзмоцніць парывісты паўночны вецер. Месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў асноўным у выглядзе мокрага снегу, а ў асобных раёнах зямлю і снег накрые. Аўтаматараў папярэджваюць, што на асобных участках дарог магчыма галалёдзіца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

На сцэне

# Найвядомейшы беларускі спектакль пакажуць анлайн



**Легендарную пастаноўку Купалаўскага тэатра «Паўлінка», гісторыя якой налічвае амаль восем дзесяцігоддзяў, сёння можна будзе паглядзець анлайн: а сёмай гадзіне вечара на відэасэрвісе VOKA адбудзецца прамая трансляцыя непасрэдна са сцэны. «Сусветным паказам» сваёй візітоўкі тэатр адзначыць Міжнародны дзень тэатра.**

«Паўлінка» з'яўляецца самым папулярным спектаклем Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Упершыню «Паўлінка» была пастаўлена ў 1944 годзе Львом Літвінавым ва ўмовах эвакуацыі ў Томску і з тых часоў стала адкрываць ледзь не кожны сезон Купалаўскага.

За амаль восемдзесят гадоў галоўную ролю ў пастаноўцы выканала каля дваццаці актрыс. Сёння Паўлінку будзе іграць Марта Голубева. Таксама на сцэну выйдуць вядомыя акцёры тэатра Марыя Захарэвіч, Павел Харланчук-Южакоў, Андрэй Кавальчук, Алена Сідарава, Мікалай Кучыц, Наталля Качаткова, Марына Гардзіёнак, Дзмітрый Тумас і іншыя.

Спектакль прылічаны да нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Анлайн-трансляцыю забяспечыць шматкамерная мастацкая здымка з розных ракурсаў — прычыніцца да падзеі можна праз мабільную прыладу VOKA альбо сайт voka.tv нават без аўтарызацыі. Такім чынам, «Паўлінка» будзе даступная ў любым пункце Беларусі і іншых краін свету. Арганізатары таксама падрыхтавалі субцітры на рускай мове.

Паказ адбудзецца пры падтрымцы партнёра 100-га сезона Купалаўскага кампаніі «А1».

**Вольга МІЦКЕВІЧ.**

**Фота з сайта Купалаўскага тэатра.**

# Надвор'е стала менш прадказальнае

## Залева ў Сухараве, ля вакзала — сонца

Мінулы год і анамальна мяккі зімовы сезон паказваюць, што клімат ужо змяняўся, прычым паўсюдна. Ва ўсіх пунктах зямнога шара сярэднегадавая тэмпература павысілася на 1,1 градуса, у Беларусі — на 1,3 градуса. «Але гэта не сведчыць аб тым, што 2020-ы будзе дакладна такі ж анамальна гарачы», — лічыць спецыяліст.

Па словах прадстаўніка рэспубліканскага Гідраметэацэнтра, глабальныя змены клімату ў першую чаргу адбіваюцца на экстрэмальнасці з'яў. Напрыклад, моцныя дажджы нярэдка носяць лакальны характар: часам на тэрыторыі вялікага горада дзесьці могуць ісці ападкі, а дзесьці яны адсутнічаюць. У сувязі з гэтым было ўстаноўлена шэсць метэаралагічных станцый у Мінску.

«Гэта першы этап вывучэння клімату гарадоў — забеспячэнне інфармацыяй, — кажа Святлана Кузьміч. — Цяпер аўтаматычныя станцыі ўсталяваныя на вуліцах Бабруйскай, Ціміразева, Радыяльнай, Каржанеўскага, Шаранговіча і Багдановіча. Першыя назіранні паказваюць, што ў розных раёнах горада адрозніваецца нават тэмпература, не кажучы ўжо пра астатнія параметры».

## Дакладнасць штармавых папярэджанняў

Акрамя таго, сёлета Белгідрамет працягне работу па пашырэнні сетак назірання. «Поспех любой службы залежыць ад яе тэхнічнай аснашчанасці, а вызначэнне надвор'я — гэта найскладанейшая тэхнічная задача», — канстатавала намеснік начальніка службы. Менавіта таму за апошнія гады Белгідрамет значна мадэрнізаваўся.

«У 2017 годзе мы распрацавалі дарожную карту, у якой прапісалі свае патрэбы на найбліжэйшую перспектыву. Праведзены тады аналіз паказаў, што для складання добрага прагнозу існуючай сеткі недастаткова, нам неабходна яе пашыраць», — расказвае Святлана Кузьміч. У цэлым у Беларусі зараз ёсць 67 пунктаў назірання за надвор'ем. Летась метэастанцыі з'явіліся ў Салігорску, Гродне і Лельчыцах. Сёлета іх запланавана ўстанавіць у Іўі і Навасёлках Гродзенскай, Кобрыне і Маларыце Брэсцкай, Плешчаніцах Мінскай, Расонах Віцебскай і Вялікім Межніку Магілёўскай абласцей, а таксама ў аграгарадку Самахвалавічы ў Мінскім раёне.

Яшчэ адзін кірунак развіцця Белгідрамета — павелічэнне сеткі радыёлакатараў. Да 2019 года, па словах спецыяліста, лакатары працавалі ў Мінску, Гомелі і Брэсце. Летась радыёлакатар з'явіўся ў Віцебску, а сёлета — у Гродне. У Брэсце цяпер мадэрнізуюць лакатар, які працуе з канца 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Такім чынам, у краіне будуць дзейнічаць аб'яднаныя ў адзіную сістэму пяць радыёлакатараў.

Расійскія калегі распрацавалі па ўзгадненні з Белгідраметам праект спецыяльнага праграмнага забеспячэння па абмене інфармацыяй метэаралагічных радыёлакацыйных назіранняў паміж Расгідраметам і Белгідраметам. Праведзена ацэнка дакладнасці ідэнтыфікацыі небяспечных гідраметэаралагічных з'яў надвор'я. Радыёлакацыя прызначана для кароткатэрміновых прагнозаў на найбліжэйшыя шэсць гадзін. Небяспечныя з'явы могуць узнікаць вельмі хутка, працягласць у іх кароткая. Іх прагназаванне ўскладнена, бо звязана з неабходнасцю ўлічыць усе фізічныя працэсы, якія праходзяць у атмасферы. А радыёлакацыя дазваляе кожныя 15 хвілін бачыць змену абстаноўкі ў атмасферы.

Акрамя гэтага, у рамках развіцця супрацоўніцтва з метэаралагічнымі службамі іншых краін Белгідрамет атрымаў доступ да інфармацыі з радараў Польшчы, Украіны, Расіі і Прыбалтыкі. Гэта дазваляе ў рэжыме анлайн выяўляць і суправаджаць небяспечныя атмасферныя з'явы на тэрыторыі сумежных дзяржаў.


snob.ru

## Зазірнуць наперад на 10 сутак

Айчынная метэаслужба ўвядзе работу па заключэнні ліцэнзійнага пагаднення з Еўрапейскім цэнтрам сярэднетэрміновых прагнозаў надвор'я, што дазволіць павялічыць своечасовасць прагнозаў да 10 сутак. «Цяпер у нас максімальны паказчык складае шэсць сутак», — паведаміў **начальнік службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Аляксандр БЯГАНСКІ.** Таксама ў рэспубліканскім цэнтры працуюць над удасканаленнем ужо існуючых метадаў прагназавання.

У прыватнасці, асваенне радыёлакацыйных звестак дазваляе развіваць сістэму звышкароткатэрміновага прагназавання. Гэта важна ў летні перыяд для прагнозаў лівеняў, шквалаў, навальніц, граду, якія налятаюць знянацку. Яшчэ адзін важны кірунак дзейнасці Белгідрамета — работа над павышэннем прафесійнай кваліфікацыі кадраў. Акрамя наяўных рэсурсаў, якімі валодаюць беларускія ВНУ, у прыватнасці БДУ, вялікі ўплыў аказваюць рэгіянальныя навучальныя цэнтры Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі. Адзін з такіх цэнтраў знаходзіцца ў Маскве — нядаўна заключана пагадненне з расійскім Гідраметэаралагічным універсітэтам. Падрыхтоўка кадраў будзе весціся ў тым ліку і на іх базе.

На пытанне карэспандэнта «Звязды», якое будзе лета-2020, спецыяліст не змог адказаць адназначна: «Нават вясна не будзе аднатыпная. Пасля рэзкага цяпла да нас прарваўся арктычны холад. А якое будзе лета, сказаць цяжка. Мы рабілі прагноз на зіму, але ён не апраўдаўся».

На пытанне, чаму прагнозы надвор'я на розных сайтах адрозніваюцца адзін ад аднаго, і часцяком даволі моцна, Аляксандр Бяганскі адказаў, што Белгідрамет нясе адказнасць толькі за прагнозы, якія размяшчаюцца на сайце ведамства www.pogoda.by, і парэкамендаваў карыстацца менавіта гэтымі звесткамі. Святлана Кузьміч дадала, што цяпер рыхтуецца новая рэдакцыя закона аб гідраметэадзейнасці, у якую будзе ўнесена пазіцыя, якая датычыцца крыніцы інфармацыі аб прагнозах надвор'я. Магчыма, тады колькасць сайтаў каляпагоднай тэматыкі значна паменшыцца.

## Гэта была цэлая сістэма

Датай утварэння гідраметэаралагічнай службы Беларусі лічыцца 1 ліпеня 1924 года. У гэты дзень быў зроблены вельмі важны крок, бо новая служба аб'яднала разрозненыя станцыі і пасты. У красавіку 1925 года быў выпушчаны першы беларускі бюлетэнь надвор'я.

У 1941 годзе, напярэдадні вайны, на тэрыторыі Беларусі дзейнічала добра тэхнічна аснашчаная для таго часу дзяржаўная гідраметэаралагічная сетка, якая налічвала 464 гідраметэаралагічныя станцыі і пасты, што з'яўляліся складнікам гідраметэаслужбы СССР. Пасля заканчэння вайны 85 % станцый і 90 % пастоў перасталі функцыянаваць, і ўсю службу давялося практычна ствараць нанава.

Кожны год у канцы сакавіка з ініцыятывы Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі пад эгідай ААН праводзіцца Сусветны дзень метэаралогіі. У мерапрыемстве бяруць удзел 192 дзяржавы. Менавіта 23 сакавіка 1950 года ўступіла ў сілу Канвенцыя гэтай арганізацыі, а само свята адзначаецца з 1961 года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Сучаснае змяненне клімату на тэрыторыі краіны пачалося з анамальна цёплай зімы 1989 года. За апошнія 30 гадоў сярэднегадавая тэмпература на тэрыторыі Беларусі вырасла на 1,3 градуса.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Неасабісты суб'ектыў



# Штосьці з галіны філалогіі

## Беларускага аналагу якой прыказкі сёння не хапае

НАШ сусед дзядзька Юзік памёр, калі мы з ягоным сынам былі ў шостым класе. Памятаю, вельмі ўразіла тады менавіта раптоўнасць сыходу з жыцця яшчэ зусім не старога чалавека. Ён вярнуўся пад вечар з працы (збіраў па вёсках малако), распрог і завёў на стайню каня, павячэраў. Позна вечарам яму нечакана стала блага — паднялася высокая тэмпература, пачаў задыхацца. Жонка выклікала «хуткую», тая памчала хворага ў Дзяржынск, пасля адтуль яго павезлі ў Мінск. Дзядзьку не выратавалі — усю ноч ён трызніў (казаў: «Коні, коні лятуць», — успамінала пасля са слязьмі цётка Марыя, яго жонка), а ў абед сканаў. «Хуткацякучая пнеўманія», — гэтыя два словы, упершыню пачутыя ў падлеткавым узросце, урэзаліся ў памяць як азначэнне нечаканай небяспекі, якая можа падсцерагчы ў любы момант...

Сын мамінай сяброўкі цёткі Надзі Віктар здаровы як дуб. Моцны, высокі, «накачаны». Здавалася б, ніякая хвароба да гэтага маладога мужчыны не прычэпіцца. Але гадоў пяць таму, вярнуўшыся з камандзіроўкі ў Расію, ён раптоўна злёг і доўгі час — мо тыдні два — балансаваў на краі жыцця ў рэанімацыі. Маці не знаходзіла сабе месца, а пасля, калі хворы пачаў крыху папраўляцца, днявала і начавала ў бальніцы, карміла яго з лыжачкі, пад рукі вадзіла ў прыбіральню: здаровы хлопец быў такі слабы, што нават не мог самастойна проста стаяць на нагах. Праз нейкі час малады арганізм і дактары ўрэшце справіліся з хваробай, але яшчэ некалькі месяцаў мужчына не мог аднавіцца. А маці яго і сёння не можа без хвалявання вымаўляць той ягоны дыягназ: двухбаковая пашыраная пнеўманія. Хвароба, якая зусім нечакана ледзь не звяла ў магілу яе трыццаціпяцігадовага сына...

ВЫ, напэўна, ужо зразумелі, дзеля чаго я пра гэтыя выпадкі, з якімі наўпрост давялося сутыкнуцца ў жыцці, пішу. Гэта ж сапраўднае «мяса» было б для сённяшніх аматараў «гарачых» навін. «У адной з вёсак Дзяржынскага раёна раптоўна памёр малаказборшчык. Ні з кім, хто быў за мяжой, ён не кантактаваў. Урачы паставілі дыягназ «пнеўманія». Наяўнасць у памерлага каранавіруса медыкі адмаўляюць»... «У Мінску ў цяжкім стане ў аддзяленне пульманалогіі шпіталізаваны малады мужчына. Ён некалькі дзён назад вярнуўся з Масквы. У яго дыягнаставана складаная пнеўманія. Маці кажа, што ў яе ўзялі тэст на наяўнасць каранавіруса»... Прыкладна так гучалі б паведамленні аб апісаных мной няшчасцях, якія адбыліся шмат гадоў назад, у сённяшняй інтэрпрэтацыі. А далей — аларм! — дзясяткі каментарыяў кшталту: «Ну ўсё, панеслася!», «Хто ж нам праўду скажа!». А калі б яшчэ асабліва пільныя ахвотнікі пакапацца ў чужой бялізне даведаліся, што праз нейкі час пасля пахавання старэйшая дачка майго суседа нарадзіла дзіця, якое пражыло ўсяго некалькі тыдняў... Як вы думаеце, ці стаў бы хто з пастаўшчыкоў актуальных навін прыводзіць словы дактароў аб тым, што прычынай цяжкай паталогіі ў дзіцяці стаў надзвычайны стрэс ягонай мамы на познім тэрміне цяжарнасці ад нечаканай страты любімага бацькі? Дзе там — бацька ж памёр ад чаго — ад пнеўманіі. Якую можа выклікаць каранавірус. А можа, і не каранавірус. Але ўсё роўна — аларм: хавайся ў бульбу і ратуйся хто можа!

І гэта, крый божа, ніякі не «сцёб». І абсалютна нікога ні ў чым я не спяшаюся абвінавачваць, бо даўно пераканалася, што ў кожнага свой уласны кодэкс гонару і кожны жыве і нешта робіць або не робіць, кіруючыся менавіта гэтым ненапісаным «дакументам». Але калі чытаеш на сайтах загалоўкі «Мужчына вярнуўся з Італіі і праз тры дні памёр ад пнеўманіі. Каранавірус у яго не выяўлены», «Сваякі памерлай жанчыны з Віцебска: у яе быў каранавірус. Медыкі: у яе была пнеўманія», — а пасля каментарыі да іх, разумееш, што людзі свядома або несвядома проста адключаюць уласны розум, а часам — і сумленне. Бо за ўсім гэтым не бачаць ні памерлага чалавека, ні яго сваякоў — канкрэтна ўзятых людзей, у якіх здарылася БЯДА. Магчыма, гэта адбываецца таму, што тыя, хто настойліва па некалькі разоў тэлефануе людзям, у якіх з хаты толькі вынеслі труну, і дапытвае «дык ці быў каранавірус?», і тыя, хто пасля ўпэўнена каментуе «канешне, быў, хто вам праўду скажа!», проста не ведаюць, што гэта насамрэч такое — БЯДА? Не чыясьці, а твая, асабістая, калі не разумееш, на якім свеце знаходзішся, калі нібыта рухаешся ў чорным густым тумане. І тут з гэтай цягучай цемры званок: «Прабачце, прыміце спачуванні, яшчэ раз прабачце, але... ад чаго памерла ваша маці (ваш муж)? А ці не было там каранавіруса (чумы, халеры, яшчэ якой трасцы)? Урачы кажуць, што не было, але ж важна і ваша меркаванне...»

НЕ па-людску? Не па-людску. Продкі добрую прыказку нам пакінулі на гэты выпадак — «У сабакі вачэй пазычыць». Калі ж пра розум, які варта ўключаць, чытаючы падобныя паведамленні. Пнеўманія — вельмі небяспечная хвароба, якая вядомая яшчэ за стагоддзі да каранавіруса. Яна была, ёсць і, напэўна, будзе заўсёды. Яна можа здарыцца з кім заўгодна і абсалютна нечакана. Ад яе сёння паспяхова вылечваюцца, але, на жаль, здараецца, што людзі ад яе і паміраюць. Кожны год, у кожнай краіне гэтая статыстыка прырастае. Але аб кожным выпадку ніхто не піша ў сеціве як аб навіне, бо смерць сама па сабе ў гэтым свеце не навіна. Сёлета пнеўманія — тая самая, спрадвечная, не ўзяла нейкі адпачынак ці канікулы, і ёй зусім не абавязковая дапамога каранавіруса, каб пасяліцца ў кагосьці ў лёгкіх. Чаму ж тады кожны яе цяжкі выпадак хтосьці, ставячы пад сумненне заключэнне медыкаў, стараецца разгледзець праз прызму заразы, якая апанавала амаль увесь свет?

«КОМУ война — кому мать родна», — адкажа нехта на гэта пытанне яшчэ адной прыказкай — рускай народнай. Спецыяльна паглядзела ў слоўніках — няма ў нашай мове такога адпаведніка. Выходзіць, настаў час яго прыдумаць?..

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**




## «УБАЧЫЦЬ ПАРЫЖ І ПАМЕРЦІ!»

Так многія і казалі, і кажуць. А я не разумела: ну навошта паміраць? Трэба з'ездзіць, паглядзець на яго, можа, нават трошкі пажыць, а потым вярнуцца ў сваю Беларусь...

Аднойчы я так бы і зрабіла. Але па парадку.

Некалі ў 60-х гадах мінулага стагоддзя, скончыўшы інстытут, я прыехала на работу ў мястэчка Варапаева. Атрымала так званыя пад'ёмныя, пазнаёмілася з калегамі і ў канцы жніўня выпадкова пачула, як адна з настаўніц угаворвала другую з'ездзіць з ёй у Парыж. Падумала яшчэ: «Вось табе і маеш: адсюль, з Заходняй Беларусі, гэта, выходзіць, можна?! І што — без праблем? Без візы?!»

— Калі вы едзеце? — яшчэ не верачы ў гэта шчасце, спытала я.

— Паслязаўтра, — пачула ў адказ.

— А можна і мне з вамі?

— Ды калі ласка! — згадзілася Хрысціна Сігізмундаўна...

У хаце, дзе здымала пакойчык, я пералічыла ўсе свае «зберажэнні». Вырашыла: калі паедзем паслязаўтра, а да першага верасня трэба ўправіцца, то грошай павінна хапіць. (Пра візу не казалі ні слова, значыць, яна сапраўды не патрэбна.) Тады пытанні: у што прыбрацца, на колькі дзён адпрасіцца ў дырэктара? Як там будзе з мовай (уся надзея на Хрысціну Сігізмундаўну, бо я вучыла нямецкую...)? А як з дарогай? Спачатку ж трэба дабрацца да Пастаў, потым да Мінска і адтуль ужо самалётам? Ці як?

З гэтымі пытаннямі я лягла спаць. Але ж які там сон, калі наперадзе такая вандроўка і калі хутка на свае вочы ўбачыш Парыж — Эйфелеву вежу, Елісейскія палі!..

Заснула хіба пад раніцу. І прыснілася мне, што я ўжо там, прыехала, што трапіла на нейкі баль, што сам Эміль Заля запрасіў мяне на вальс «Абарваныя струны» і, танцуючы, увесь час наступае на ногі.

Прачнулася ад мяўкання ката, які і сапраўды пад нейкую «музыку» таптаўся па маіх каленях.

...У школе, сустрэўшы Хрысціну Сігізмундаўну, я адразу ж спытала, ці адпрасілася яна ў дырэктара.

— А навошта? — здзівілася каляжанка.

— Каб з'ездзіць у Парыж...

— Дык заўтра ж нядзеля, выхадны.

— Але ж за ім будзе панядзелак? — нясмела заўважыла я.

— У панядзелак магазін закрыты!

— А ён, што, там — адзін?

— Канешне...

Толькі тут да мяне стала даходзіць, што з Парыжам нешта не так.

— А на чым мы паедзем? — спытала для праверкі.

— На цягніку. Тры станцыі...

Вечарам гаспадыня сказала мне, што Парыж — гэта вёсачка, і што назву ёй даў сам Напалеон. Ён, маўляў, начаваў там, а раніцай агледзеў наваколле і сказаў: «Якая прыгажосць! Тут сапраўдны Парыж!»

...Яго, беларускі, цяпер адкрылі многія турысты: убачылі і тамтэйшую Эйфелеву вежу, і палі — мо не горшыя за Елісейскія.

А хто не паспеў яшчэ з'ездзіць туды, настойліва раю: гэта і блізкай, і танней, а па сённяшнім часе дык яшчэ і бяспечней.

**Зоя Наваенка,**
*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

## ЖОНКА — НАЗОЎНІК КАНКРЭТНЫ, але... абстрактны

Без малога дзесяць гадоў таму, пасля другога дэкрэтнага водпуску, я прыйшла працаваць настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў сваю ж, можна сказаць, родную школу. Спадабалася! А найболей — дык пяты клас. Дзеці ў ім вучыліся так сабе, некаторыя — нават слаба. Але ўсе яны былі такія блізкія, такія свае, вясковыя, шчырыя. З імі адбывалася столькі вясёлага...

Ну вось, напрыклад, праходзім разрады назоўнікаў: агульныя, уласныя, зборныя, рэчыўныя.

— «Мёд» — гэта які разрад? — спытала потым, каб праверыць веды.

— Уласны, — адказвае самы смелы вучань.

— Чаму?

— Дык ён жа ў нас свой, не куплёны...

Дзяўчаты з класа потым доўга прасілі Валіка (так звалі хлопчыка) прынесці ўласнага мёду...

Праз некалькі ўрокаў новая тэма: «Канкрэтныя і абстрактныя назоўнікі». Зноў жа, каб дзеці лепш запомнілі, я кажу ім, што многія з першых (канкрэтных назоўнікаў) можна памацаць і ўбачыць, а вось другія ўжо не.

— Зразумелі? — пытаюся.

Згодна маўчаць.

— Тады прывядзіце прыклады.

— Назоўнік «жонка», — пачаў адзін з вучняў, — канкрэтны, бо яе можна памацаць. Але ён і абстрактны...

— Гэта чаму? — здзівілася я.

— Таму што жонкі ў мяне няма.

...Іншы хлопчык, ужо праз гады, дзевяцікласнікам, стаў чытаць на памяць вядомае:

*«Мой родны кут,*
*як ты мне мілы!*
*Забыць цябе*
*не маю сілы...»*

А вось што далей — забыўся, стаў у кнігу падглядваць. «Непарадак», — «сігналіць» мне дзяўчынка з першай парты.

— Я бачу, — кажу ёй.

А вучань падумаў, што гэта падказка — яму. І давай паўтараць:

*«Забыць цябе*
*не маю сілы.*
*Я бачу...»*

Клас лёг ад рогату!

...Калі тыя мае «пяцікласнікі» ўжо заканчвалі школу, на ўрок беларускай мовы прыйшла завуч. Мы разглядалі тэму «Зваротак» на прыкладзе народных замоў.

— А цікава, ці ёсць замовы для здачы экзаменаў? — спытала адна з дзяўчынак.

Я адказала, што, напэўна, ёсць. А калі не ведаеш, то можна прыдумаць свае — з любымі словамі, галоўнае — шчырымі.

**Таццяна Марцэвіч,**
*в. Ёдкі, Лідскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж чарговае і шчырае: «Пішыце» (абавязкова з кантактамі для зваротнай сувязі), бо ўсе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца — яны ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую. Вынікі яго будуць падведзены на пачатку наступнага года. Журы — і вялікае чытацкае пад старшынствам спадарыні Соф'і КУСЯНКОВАЙ з Рагачоўшчыны, і маленькае рэдакцыйнае на чале з першым намеснікам галоўнага рэдактара спадарыняй Наталляй КАРПЕНКАЙ — працуе. Пераможцаў чакаюць прызы.**

# ЯКІМ БЫЦЬ «РАЗУМНАМУ» ГОРАДУ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Уявім сабе звычайную сітуацыю. МКАД функцыянуе ў штатным рэжыме, свецяць дынамічныя дарожныя знакі, якія паказваюць хуткасць «100», «90»... Але недзе адбылося ДТЗ. Тут жа пачынае збірацца чарга з аўтамабіляў. Адпаведна, мы выводзім на табло інфармацыю пра паніжаную хуткасць — «80», «70». Пры гэтым мы паказваем: наперадзе ўтварыўся затор. Трэба з'ехаць з МКАД у горад. Гэта адбіваецца на бартавых прыладах аўтамабіля і ў смартфоне кіроўцы, — адзначыў Дзмітрый Навой. — Але толькі гэта зрабіць мала. Калі, скажам, сем тысяч з іх вырашаць з'ехаць у горад, то сам горад мусіць адрэагаваць на гэта і такую колькасць машын прыняць за абмежаваны прамежак часу. Сітуацыі бываюць розныя, і на з'ездзе перад месцам ДТЗ не заўжды магчыма трапіць у горад. У такім разе сістэма павінна прапанаваць кіроўцам пакінуць кальцавую аўтадарогу на ранейшых з'ездах. Калі казаць іншымі словамі, то мэта сістэмы — перанакіраваць транспартныя патокі такім чынам, каб не ўтварыўся калапс.

Але сёння для смартфонаў ужо існуюць рашэнні, якія дазваляюць ацэньваць дарожную сітуацыю. Прыклад — Яндэкс-карты, на якіх можна паглядзець хуткасць патоку на пэўных участках дарог. У залежнасці ад гэтага яны падсвечваюцца рознымі колерамі, аналагічнымі набору на святлафоры, — чырвоным, жоўтым і зялёным. Чым жа прапанаваная ДАІ сістэма будзе лепшая?

аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.
прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 955.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 26 сакавіка 2020 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

27 сакавіка 2020 г. № 12 (548)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

## Арыентацыя на спажыўца



Фота БелТА.

### Каб павысіць попыт на прадукцыю ААТ «Камволь», тут распрацавалі адмысловую стратэгію прыцягнення ўвагі пакупніка

**З тым, якія вынікі прынесла праведзеная не так даўно мадэрнізацыя прадпрыемства, што хвалюе калектыў і перспектывамі далейшага развіцця вытворчасці, пазнаёмілася старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаная па горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА, якая наведала гэтае адкрытае акцыянернае таварыства ў сераду, 25 сакавіка.**

### Быць у трэндзе

Нагадаем, што ў 2017 годзе, згодна з указам Прэзідэнта краіны, на камбінаце праводзіліся мадэрнізацыя і рэканструкцыя новай вытворчасці па выпуску канкурэнтаздольных тканін бізнес- і эканомкласаў. Маштабная мадэрнізацыя завяршылася, і на сёння прадпрыемства можа прапанаваць спажыўцам шырокі асартымент тканін розных відаў: для дзелавых касцюмаў, прывабных сукенак, модных спадніц і гэтак далей. Калектыў прадпрыемства — а гэта 760 чалавек — цяпер працуе ў двухзменным рэжыме. Попыт на прадукцыю ёсць, але, акрамя выпуску тканін, трэба быць у трэндзе модных тэндэнцый і запатрабаванняў рынку, каб адпавядаць сучасным густам. Менавіта выпуск гатовай швейнай прадукцыі — а такую задачу паставіў кіраўнік дзяржавы — дазваляе арыентавацца ў спажывецкіх запытах, а таксама выраблягць прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю, што, безумоўна, адбіваецца на росце даходаў акцыянернага таварыства. Так з'явілася ідэя самастойнага пашыву моднай прадукцыі са сваіх тканін і, адпаведна, арганізацыі новага кірунку на камбінаце — работы дызайн-цэнтра.

стар. 2

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

## АГУЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

### Ці патрэбны змяненні ў рабоце з даўжнікамі жыллёва-камунальных паслуг?

**Каб спагнаць запазычанасць з даўжнікоў, заканадаўствам прадугледжаны пэўны механізм узаемадзеяння самых розных службаў — ад разлікова-даведачных цэнтраў і аддзелаў прымусовага выканання да пастаўшчыкоў паслуг і нават міліцыі (пра гэта «МС» пісала ў № 10 за 13 сакавіка). Здаецца, працэс наладжаны і ўсё павінна працаваць як гадзіннік.**

**Аднак усе памятаюць рэзанансную навіну, калі ў кватэры на сталічнай вуліцы Пляханава знайшлі памерлую адзінокую жанчыну, якая не плаціла за паслугі з 2017 года. І больш за ўсё суседзяў неплацельшчыцы спалохала тое, што ў памяшканні гарэла фаерка і была ўключана вада...**

стар. 4


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Парламенцкі сезон — 2020



Да адкрыцця вясенняй сесіі застаецца менш чым тыдзень. Што ў заканадаўчым партфелі? стар. 3

### Усё сваё!



Дапамога асабістым падсобным гаспадаркам — у дзяржаўным прыярытэце. стар. 13

### Прыбыткі і выдаткі



Ці патрэбны камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы пры сельвыканкамах? стар. 13

### Выбар года



Старэйшына з маленькай вёскі ў Жлобінскім раёне, што на Гомельшчыне, паказала, на што здольная ініцыятыва. стар. 15

### 7 тысяч дрэў і мільён кветак



Як магілёўскія дэпутаты разам з камунальнікамі і жыхарамі наводзяць прыгажосць у горадзе. стар. 16

# Неабходны клопат

**Важна дайсці да кожнага пажылога чалавека і даведацца, якая дапамога яму патрэбна.**

Такую задачу падчас рабочай паездкі ў Ашмянскі раён, што на Гродзеншчыне, паставіла **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля КАЧАНАВА.**

Яна сустрэлася з дэпутацкім корпусам рэгіёна, у цэнтры ўвагі былі актуальныя пытанні развіцця Прынёмання. Перад гэтым спікер верхняй палаты парламента пазнаёмілася з работай мясцовых прадпрыемстваў і цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна, паведамляе БелТА.



Фота БелТА.

«У цэнтры ўвагі знаходзіцца выкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы. Адно з іх датычыцца і ўважлівага стаўлення да пажылых людзей, якім цяпер важна пабыць дома», — адзначыла Наталля Качанава. Гаворка ідзе пра дастаўку пажылым дахаты прадуктаў харчавання, медыкаментаў, аказанне іншай дапамогі, падкрэсліла яна. Важна, што да гэтай работы падключыліся не толькі цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, але і валанцёры з ліку моладзі, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый.

«Пры гэтым пажылыя людзі часцяком вельмі сціплыя, яны не хочуць некага прасіць, турбаваць. Таму важна дайсці да кожнага, даведацца, у чым ён мае патрэбу. Калі ёсць дзеці, родныя, якія могуць даставіць усё неабходнае, — гэта добра. У адваротным выпадку трэба дапамагчы і зберагчы», — адзначыла Наталля Качанава.

На яе думку, у Ашмянскім раёне, дзе пражывае больш за 8 тысяч пенсіянераў, гэтая работа пастаўлена на належным узроўні. Трэба, каб так было і ў іншых раёнах. Падчас сустрэчы з дэпутацкім корпусам рэгіёна Наталля Качанава заклікала народных абраннікаў актыўна ўключыцца ў садзейнічанне пажылым людзям. Бо менавіта дэпутаты добра ведаюць свае раёны, акругі, разумеюць, дзе неабходная дапамога.

# Пад знакам якасці

**Аналіз сітуацыі непасрэдна на месцах дазваляе ўбачыць рэальную карціну і прыняць аптымальныя рашэнні па падтрымцы прадпрыемстваў.**

Такое меркаванне выказала **спікер верхняй палаты Наталля КАЧАНАВА** падчас рабочай паездкі ў Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці.

Старшыня Савета Рэспублікі азнаёмілася з дзейнасцю мясцовых прадпрыемстваў — Ашмянскага дражджавога завода і ААТ «Радыётэхніка», паведамляе БелТА.

«Ашмянскі раён хоць і невялікі, але з сур'ёзным прамысловым патэнцыялам. У людзей, што важна, ёсць магчымасць рэалізаваць сябе ў прафесійным плане. Станоўчы трэнд у тым, што ў большасці прадпрыемстваў ёсць рост паказчыкаў у параўнанні з папярэднім годам. Гэта значыць, што ў людзей ёсць праца, стабільная заработная плата», — адзначыла Наталля Качанава.

«Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача дайсці да кожнага прадпрыемства. Па Ашмянскі дражджавым заводзе і ААТ «Радыётэхніка» ёсць пытанні. Напрыклад, неабходна падцягнуць заработную плату. Для гэтага трэба выпускаць сучасную, арыентаваную на экспарт, якасную прадукцыю. Акцэнт на гэтым зроблены невыпадкова: наступныя пяць гадоў пройдуць пад знакам пяцігодкі якасці», — адзначыла Наталля Качанава.

Яна падкрэсліла, што мясцовыя прадпрыемствы не застануцца па-за ўвагай. Напрыклад, на кантролі ў цэлым у краіне сітуацыя з дражджавой галіной. Прадпрыемства з Ашмянаў здольна мадэрнізавацца і выйсці на новыя рынкі.

«Мы бачым, як складваецца сітуацыя ў нашых суседзяў, таму важна скарэкціраваць работу нашых арганізацый у новых умовах. Цяпер прапрацоўваюцца меры для падтрымкі прадпрыемстваў у розных сферах. Паездкі на месцы, у рэгіёны даюць магчымасць убачыць рэальную карціну і прымаць узважаныя і правільныя рашэнні», — падкрэсліла Наталля Качанава.

# Арыентацыя на спажыўца

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*



— Прадпрыемству была пастаўлена задача не проста выпусціць тканіну — прадукцыя павінна быць з высокай дабаўленай вартасцю, — звярнула ўвагу ў размове з журналістамі Наталля Качанава. — Гэта значыць, што павінна быць не сыравіна, не матэрыялы, а канчатковы прадукт, які будзе вырабляцца з тканін. Зразумела, гэта ўплывае і на заробкі людзей, якія тут працуюць, і на эфектыўнасць работы прадпрыемства.

Спікер верхняй палаты парламента пазнаёмілася з работай дызайн-цэнтра, які запрацаваў сёлета і ўжо рыхтуе калекцыі моднага адзення да будучага асенне-зімняга сезона 2020/2021. Малады спецыяліст Інэса Акуліч, якая працуе тут пасля заканчэння Акадэміі мастацтваў, увасабляе ў жыццё самыя яркія ідэі. Дзяўчына прыйшла сюды па размеркаванні і кажа, што падабаецца ўсё: калектыў, умовы, магчымасць самарэалізацыі.

**Кіраўнік дызайн-цэнтра Эльвіра ЖВІКАВА** расказала аб тым, што зараз у распрацоўцы і дзе ўсю гэтую прыгажосць можна будзе набыць:



Малады спецыяліст Інэса АКУЛІЧ.

— Сёлета мы рэалізуем стартап лініі мужчынскага адзення: рыхтуем калекцыю прыгожай дзелавой вопраткі, якая будзе складацца прыкладна з 30 мадэлей, — паведаміла яна. — У жніўні—верасні плануем адкрыць адмысловы магазін у сталіцы.

Што датычыцца доўгатэрміновых планаў дызайн-цэнтра, фэшн-дызайнер сцвярджае, што галоўная мэта — радыкальна змяніць стаўленне да айчыннага прадукту, то-бок пераканаць спажыўцоў у якасці, камфорце і актуальнасці тавараў беларускага легпрама. Што цалкам адпавядае дэвізу палітыкі прадпрыемства ў галіне якасці: «Вытворцаў шмат — спажывец адзін», таму арыентуюцца тут на запатрабаванні спажыўца.

Дарэчы, рыхтуецца і жаночая калекцыя адзення: цяпер у распрацоўцы спецыялістаў дызайн-цэнтра знаходзіцца больш за 100 артыкулаў тканін на любы густ.

## Жыллё, садкі і добраўпарадкаванне

Усё вышэйпералічанае — гэта, так бы мовіць, далейшыя перспектывы прадпрыемства: кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя. Аб тым, што на сённяшні момант хвалюе калектыў, Наталля Качанава пацікавілася ў адным з цэхаў ААТ «Камволь».

Маладыя людзі, якіх на прадпрыемстве працуе больш за 30 %, пацікавіліся далейшым лёсам другога ведамаснага інтэрната, што павінен быць пераведзены ў статус дома кватэрнага тыпу. Першы, дарэчы, здалі ў эксплуатацыю яшчэ ў 2010-м, і работнікі прадпрыемства атрымалі магчымасць пераехаць у свае кватэры. У адносінах да другога пяціпавярховага ведамаснага інтэрната, які знаходзіцца побач на вуліцы Сонечнай, вырашылі пайсці такім жа шляхам. Нават распрацавалі ўжо праект рэканструкцыі пад шматкватэрны дом на 115 кватэр. Цяпер праектная дакументацыя знаходзіцца на разглядзе экспертызы. Разам з тым застаецца адкрытым пытанне адчужэння аб'екта па рэштковым кошце, бо інтэрнат эксплуатуецца з 1957 года.

Спікер Савета Рэспублікі даручыла адказным асобам разабрацца ў сітуацыі і падрабязна пазнаёміць з вынікамі гэтага разгляду калектыў прадпрыемства.

Прагучала і пытанне недахопу месцаў у дзіцячых садках непадалёк ад прадпрыемства, бо асноўную калектыву складаюць жанчыны, якія спяшаюцца на работу і хацелі б завесці малога ў садок як мага бліжэй да камбіната.

Як патлумачыў **кіраўнік адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска Пётр ШОСТАК,** на сённяшні момант у раёне функцыянуюць 47 дзіцячых дашкольных устаноў, але запатрабаванасць у месцах застаецца. Паводле планаў сталічных улад, у Ленінскім раёне запланавана будаўніцтва новага дзіцячага садка, разлічанага на 190 месцаў. У эксплуатацыю аб'ект павінен быць здадзены ў 2023 годзе.

Наталля Качанава даручыла раённай вертыкалі ўлады прааналізаваць запатрабаваную колькасць месцаў у дзіцячых садках крокавай дасягальнасці ад «Камволя» і праінфармаваць калектыў аб магчымасці ўладкаваць у іх дзяцей.

Узнімаліся і пытанні добраўпарадкавання набярэжнай Свіслачы ад вуліцы Аранскай да Дзянісаўскай. Спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што добраўпарадкаванне — прыярытэтная задача ў Год малой радзімы. З кіраўніцтвам Мінска вызначаны планы на бягучы год: колькі высадзіць дрэў, кустоў, кветак. Наталля Качанава даручыла ўключыць добраўпарадкаванне гэтага аб'екта ў сёлетнія планы гарадскіх улад.

## Кошт і якасць павінны быць супастаўнымі

Падводзячы вынікі наведвання прадпрыемства, Наталля Качанава ў размове з журналістамі звярнула ўвагу на тое, што пасля завяршэння мадэрнізацыі і з'яўлення сучаснага абсталявання «Камволю» неабходна выходзіць на зададзеныя параметры, вызначаныя інвестыцыйным праектам.

— Інвестпраект рэалізаваны, цяпер трэба выпускаць тканіны больш сучасныя, добрай якасці. Асартымент тут нядрэнны, але трэба, каб і кошт, і якасць былі супастаўнымі, — падкрэсліла яна, звярнуўшы ўвагу на тое, што ў сучасных умовах, калі вельмі няпроста канкурыраваць на рынку, ажыццяўляць экспартныя пастаўкі, у краіне павінна быць прадукцыя высокай якасці і па прымальным кошце. Тым больш што ў нас шмат прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, якія выкарыстоўваюць тканіну, і вельмі важна, каб сыравіна для іх была айчыннай вытворчасці.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота БелТА.**

**ДАВЕДКА «МС»**

**ААТ «Камволь» — найбуйнейшы вытворца тэкстыльнай прадукцыі, які валодае поўным цыклам вытворчасці: ад вырабу пражы да выпуску тканіны і пастаўкі прадукцыі ў краіны Еўропы і СНД.**

**За ўсю гісторыю тканіны камвольнага камбіната адпраўляліся спажыўцам у больш чым 30 краін блізкага і далёкага замежжа. Цяпер геаграфія экспарту прадпрыемства ахоплівае 15 краін: ад Азербайджана да Турцыі.**

# Што нам рыхтуе новы парламенцкі сезон?

**Напярэдадні адкрыцця 2 красавіка вясенняй сесіі Савета Рэспублікі пра прыярытэты работы сенатараў у новым парламенцкім сезоне і яго асаблівасці расказалі журналістам старшыні профільных Пастаянных камісій верхняй палаты. Размова адбылася ў час брыфінгу ў прэс-цэнтры БелТА.**



Фота БелТА.

## Удзел ва ўсіх стадыях падрыхтоўкі закона

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ** акцэнтаваў увагу на двух важных момантах. Калі раней члены Савета Рэспублікі пачыналі працаваць з ужо прынятымі ў двух чытаннях Палатай прадстаўнікоў законапраектамі — іх прымалі ці адпраўлялі на дапрацоўку, — то цяпер сенатары актыўна ўключаюцца ў сам заканатворчы працэс і непасрэдна ўдзельнічаюць у ім на ўсіх стадыях падрыхтоўкі закона сумесна з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў. Такі падыход дазваляе сенатарам яшчэ да ўнясення законапраекта ў Савет Рэспублікі загадзя сфарміраваць сваю першапачатковую палітычную і прававую пазіцыю ў дачыненні да дакумента. У выніку павышаецца якасць будучага закона.

Другі момант: роўна год таму пачаў дзейнічаць Закон «Аб нарматыўна-прававых актах Рэспублікі Беларусь». Гэта базавы дакумент, які фарміруе аснову прававой сістэмы нашай дзяржавы. Новая рэдакцыя закона ўключыла ў сябе цэлую лінейку прававых навацый.

Сяргей Сівец таксама паведаміў, што на разглядзе ў парламенце знаходзяцца 62 законапраекты, з іх ужо 18 прынятыя Палатай прадстаўнікоў у першым чытанні. Іх большасць будзе знаходзіцца ў фокусе ўвагі членаў Савета Рэспублікі на вясенняй сесіі верхняй палаты.

Дарэчы, паводле слоў Сяргея Сіўца, у партфелі Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве цяпер знаходзіцца дзесяці законапраектаў, чатыры з іх прынятыя Палатай прадстаўнікоў у першым чытанні. Гэта дакументы, якія датычацца змен у кодэксах. Цікавасць у грамадстве выклічуць змены ў Закон «Аб натарыяльнай дзейнасці». Згодна з папраўкамі, уводзіцца адказнасць натарыуса. Яна можа надысці ў выніку прычынення шкоды грамадзянам па віне яго дзеянняў.

## Каб людзі жылі больш камфортна

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ** у пачатку свайго выступлення выказаў думку, што асноўная задача заканадаўчага працэсу ў верхняй палаце — зрабіць жыццё людзей больш камфортным. Невыпадкова законапраекты, якія будуць разглядацца на вясенняй сесіі Савета Рэспублікі, у той ці іншай ступені звязаныя з падзеямі, што сёння адбываюцца ў свеце. Напрыклад, у Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці цяпер разглядаюцца надзвычай актуальныя законапраекты «Аб ахове здароўя», «Аб лекавых сродках», «Аб інвалідах» і «Аб Чырвоным крыжы». Яны не толькі звязаныя паміж сабой, але і дапаўняюць адзін аднаго. Усе чатыры законапраекты прыйшлі ў Савет Рэспублікі амаль адначасова, — і гэта невыпадкова.

Віктар Лісковіч асабліва засяродзіўся на рабоце членаў Савета Рэспублікі над законапраектам «Аб ахове здароўя». Змены ў ім сенатар назваў планавай карэкціроўкай, бо час імкліва ляціць, медыцына хутка развіваецца, ужо шэраг перамен, новых кірункаў дзейнасці ў ахове здароўя патрабуюць заканадаўчага зацвярджэння.

Напрыклад, акцэнт будзе зроблены на якасных параметрах работы медыкаў. Так, беларуская сістэма аховы здароўя выбудавана і ўвогуле нядрэнна працуе. Але наспела неабходнасць удакладніць палажэнні аб якасці медыцынскай дапамогі насельніцтву. У сувязі з гэтым важным з'яўляецца пытанне аб акрэдытацыі медыцынскіх устаноў, што дазволіць выпрацаваць аднолькавыя стандарты лячэння пацыентаў незалежна ад месцазнаходжання бальніцы ці паліклінікі. Мяркуецца, што працэс акрэдытацыі працягнецца да 2023 года. Такім чынам, рэгіёны маюць час падцягнуць свае медыцынскія ўстановы да ўзроўню сучасных патрабаванняў. Напрыклад, ужо паўстала пытанне аб стварэнні электроннай сістэмы аховы здароўя.

Віктар Лісковіч таксама спыніўся на іншых законапраектах, якія будуць разглядацца на вясенняй сесіі Савета Рэспублікі. Важнымі і своечасовымі, у прыватнасці, будуць змены ў Закон «Аб лекавых сродках».

## Аб спрашчэнні візавага рэжыму з ЕС

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ,** зразумела, сваё выступленне прысвяціў міжнароднай тэматыцы. У камісіі зараз знаходзіцца 24 законапраекты, якія датычацца сфер міжнародных адносін, сусветнай эканомікі і нацыянальнай бяспекі. Сярод прыярытэтных парламентарый вылучыў законапраекты, якія прадугледжваюць новыя меры па прадухіленні легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці, распаўсюджвання зброі масавага знішчэння.

І, бадай, самым галоўным і чаканым стала паведамленне сенатара аб тым, што на вясенняй сесіі плануецца ратыфікаваць пагадненні аб спрашчэнні візавага рэжыму з ЕС.

Сяргей Рачкоў сказаў, што члены Савета Рэспублікі актыўна ўключыліся ў міжнародную дзейнасць. Было сфарміравана 12 дэлегацый Нацыянальнага сходу ў міжпарламенцкіх арганізацыях, вызначылі склад 72 рабочых групы і чатыры міжпарламенцкія камісіі па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў. Старшыня Пастаяннай камісіі падкрэсліў, што работа гэтых парламенцкіх інструментаў будзе накіравана ў першую чаргу на ўзаемадзеянне з нашымі стратэгічнымі партнёрамі: Расіяй, Кітаем, краінамі СНД, а таксама Еўрапейскім саюзам і краінамі далёкай дугі. Паводле слоў Сяргея Рачкова, нягледзячы на невялікі тэрмін работы Савета Рэспублікі новага склікання, паспяхова былі праведзены два важных афіцыйныя візіты парламенцкіх дэлегацый Расіі і В'етнама.

**Леанід ТУГАРЫН.**

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# НАВУЧЫЦЬ БЫЦЬ ГРАМАДЗЯНАМІ

## Якія пытанні ўздымаюць людзі на прыёмах, і пра што пытаюцца школьнікі



**Дэпутат Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу краіны, старшыня Жабінкаўскага раённага Савета дэпутатаў Анатоль ШАЛТАНЮК у сваёй рабоце вялікую ўвагу ўдзяляе патрыятычнаму выхаванню моладзі. У маладосці Анатоль Віталевіч атрымаў пэўны досвед работы ў маладзёжнай арганізацыі, і ў стасунках з цяперашняй моладдзю сенатару часам даводзіцца згадваць свае камсамольскія гады.**

Так было і на сустрэчы са старшакласнікамі школы № 3 горада Жабінкі падчас правядзення адкрытага дыялогу. Пакаленне эпохі інфармацыйных тэхналогій здзівіла сваімі філасофскімі пытаннямі наконт сутнасці паняцця грамадзяніна краіны, катэгорый патрыятызму і любові да Радзімы.

— Кожны з юнакоў і дзяўчат, што маюць у кішэнях смартфоны з інфармацыяй пра цэлы свет, цікавіцца вечнымі паняццямі, такімі адначасова простымі і складанымі рэчамі, — заўважыў суразмоўнік. — На гэтай сустрэчы яшчэ раз упэўніўся, як важна гаварыць з нашымі самымі юнымі грамадзянамі, разважаць разам з імі, тым самым прывучаць іх думаць і аналізаваць, а не толькі глытаць інфармацыю з экрана свайго гаджэта. Парадавала, што юнакі і дзяўчаты актыўна распытвалі пра работу Савета Рэспублікі. Значыць, цікавяцца палітычнай сістэмай краіны, якую ім давядзецца выстройваць і ўдасканальваць у будучым.

З моладдзю заўсёды камунікаваць цікава, падкрэсліў Анатоль Віталевіч.

А вось з іх бацькамі, дзядулямі, бабулямі сенатару даводзіцца вырашаць дарослыя пытанні. Паводле слоў сенатара, найбольш зваротаў грамадзян падчас прыёмаў па-ранейшаму датычацца добраўпарадкавання тэрыторый. Просяць паспрыяць задуме падсыпаць дарогі, усталяваць яшчэ адзін ліхтар на вуліцы ці мадэрнізаваць лінію электраперадач.

Дарэчы, пытанне аб рэканструкцыі лініі ўзнікла, калі на прыём прыйшла пенсіянерка з вёскі Новыя Дворы. Жанчына пажадала набыць электрычны кацёл для ацяплення дома. Але ва ўстаноўцы абсталявання ёй адмовілі, бо лінія электраперадач не адпавядае сучасным патрабаванням бяспекі. Іншымі словамі, трэба цягнуць новую лінію, каб напружання хапала на электракацёл. Дакументы ў выглядзе дэпутацкага запыту накіраваны ў электрасеткі. Ёсць вялікая імавернасць, што гэтую работу ўключаць у план на наступны год.

А вось заяўнікам з вёскі Падлессе ўдалося дапамагчы аператыўна. Жыхары вёскі прасілі, каб маршрутка Брэст—Хмелева заязджала ў іхнюю вёску. Зварот быў накіраваны ў Брэсцкі аўтобусны парк, і маршрут працягнулі яшчэ на пяць кіламетраў. Такім чынам, у выхадныя дні маршрутка забярэ людзей і з Падлесся.

Па выніках аднаго звароту ўдалося раскрыць непаразуменне. Да сенатара звярнулася цешча жыхара райцэнтра — яму налічылі падатак за гараж, якога... той не мае. Пасля разбораў і высвятленняў аказалася, што гаспадар гаража — поўны цёзка названага грамадзяніна, а першы плаціў падатак за чужы гараж. Падатковая інспекцыя прынесла прабачэнні грамадзяніну, службовыя асобы абяцалі ў найбліжэйшы час правесці пераразлік і вярнуць грошы, якія былі выплачаны без усякіх падстаў.

А нядаўна прыйшла жанчына з пытаннем адначасова да сенатара і старшыні райсавета. Яна цікавілася, што робіцца канкрэтна ў Жабінцы для прафілактыкі каранавіруса. Пенсіянерка выказала сваю заклапочанасць сітуацыяй з распаўсюджваннем небяспечнай інфекцыі і папрасіла рэалізаваць сваё права на атрыманне інфармацыі. Жанчына пыталася, дзе будуць размяшчаць людзей у выпадку захворвання, ці хапае ў раённай бальніцы неабходнага абсталявання. Для адказу на пастаўленыя пытанні запрасілі прадстаўніка цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, а яшчэ паказалі матэрыялы, апублікаваныя на гэты конт у раённай газеце. Аказалася, што некаторыя аспекты ўзнятых праблем ужо былі растлумачаныя ў раённай прэсе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# АГУЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ



rg.ru

## ЗРАБІЛІ ЎСЁ НЕАБХОДНАЕ

З даўжнікамі адразу пачынаюць працаваць раённыя разлікова-даведачныя цэнтры: налічваюць пеню, звяртаюцца да сваякоў, адпраўляюць паведамленні на хатнія тэлефоны і па пошце, наведваюць неплацельшчыкаў разам з міліцыяй, паведамляюць пастаўшчыкам пра неабходнасць адключэння паслуг і заяўляюць розныя хадайніцтвы.

Як адзначылі ў філіяле «Адзіны разлікова-даведачны цэнтр Мінска», што датычыцца выпадку на вуліцы Пляханава, то спецыялісты цэнтра зрабілі са свайго боку ўсё неабходнае.

— Гэта непрыемны момант — адзінокія людзі, у якіх няма сваякоў, у такіх выпадках застаюцца кінутыя на волю лёсу. Нашы супрацоўнікі не маюць інфармацыі пра прыватнае жыццё ўласнікаў, і менавіта суседзі — першыя, хто можа нешта западозрыць і паведаміць пра гэта ў пэўныя службы, — лічыць **начальнік аддзела па спагнанні дэбіторскай запазычанасці філіяла «Адзіны РДЦ Мінска» Эла ЛАЗАРАВА.** — Яны бачаць, як чалавек заходзіць у пад'езд, могуць пачуць шум ці пах. Яны — першыя, хто мог «забіць у звон», паведаміць, што даўно не бачылі грамадзянку, што яе паштовая скрынка перапоўнена карэспандэнцыяй.

Спецыялісты сталічнага АРДЦ лічаць, што існуючых мер уздзеяння на грамадзян, якія маюць запазычанасць па аплаце ЖКП, сёння дастаткова. Але не заўсёды хапае пэўнага ўзроўню іх прымянення з боку адпаведных арганізацый і дзяржаўных органаў.

— Мы лічым, што нашы спецыялісты здзейснілі ўвесь комплекс мер, якія прадугледжаны заканадаўствам. Наведваць неплацельшчыкаў мы можам толькі з прадстаўнікамі РУУС, і мы не адзін раз накіроўвалі ім лісты з просьбамі дапамагчы ў гэтым пытанні. Акрамя таго, мы не маем права спыніць аказанне паслуг, РДЦ не з'яўляецца арганізацыяй, якая іх ажыццяўляе, — тлумачыць Эла Мікалаеўна. — Мы таксама накіроўвалі выканаўчыя лісты ў раённы аддзел прымусовага выканання, не адзін раз звярталіся да супрацоўнікаў ЖЭУ і пастаўшчыкоў, каб яны спынілі аказанне паслуг. Спецыялісты неаднаразова адпраўлялі папярэджанні пра адчужэнне маёмасці ў ЖРЭА, спецыялісты якога, у сваю чаргу, павінны былі паведаміць пра гэта жанчыне і накіраваць іск у суд.

Аднак, нягледзячы на ўсе дзеянні супрацоўнікаў РДЦ, у кватэры жанчыны гарэла фаерка і была ўключана вада. І вось менавіта тут у АДРЦ звяртаюць увагу на тое, што яны займаюцца выключна разлікам, улікам і налічэннем аплаты паслуг.

— І чаму так здарылася, трэба пытаць не ў нас, а звярнуцца да супрацоўнікаў Мінгаза і Мінскводаканала — як яны рэагавалі на неаднаразовыя лісты з нашага боку, — лічыць спецыяліст.

## УСЁ НЕ ТАК АДНАЗНАЧНА

Калі ж у РДЦ зрабілі ўсё неабходнае, то чаму атрымалася так, што ў кватэры невядома колькі часу гарэў газ і цякла вада? Чаму так здарылася, у Мінскводаканале мы даведацца не змаглі — спецыялісты адмовіліся каментаваць сітуацыю. Той жа пазіцыі, пакуль ідзе следства, прытрымліваюцца і ў Мінгазе. У ЖЭУ № 2 Ленінскага раёна Мінска, спецыялісты якога абслугоўваюць дом, таксама адмовіліся ад каментарыяў і папрасілі звярнуцца ў раённую адміністрацыю. У прыёмнай дырэктара ЖРЭА, куды са слоў супрацоўнікаў РДЦ былі адпраўлены папярэджанні аб адчужэнні маёмасці, паведамілі, што іх арганізацыя нават не працуе з запазычанасцю па аплаце ЖКП з боку фізічных асоб.

А вось у адміністрацыі Ленінскага раёна, наадварот, пайшлі на адкрыты дыялог і расказалі, што ў кватэры ўласніцы сапраўды гарэла фаерка, а вада з'явілася ад таго, што змешвальнік пацёк.

— Выпадак не такі просты, як на першы погляд можа здацца. Жыхары кватэры знізу патэлефанавалі ў службу «115», калі ўбачылі сляды залівання ў сваім жылым памяшканні. І гэта быў толькі адзін выпадак, калі суседзі звярнуліся да камунальнікаў наконт той кватэры, — тлумачыць **першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска Мікалай СТРОК.** — Спецыялісты ЖЭУ адразу ж выехалі на месца і перакрылі ваду ва ўсім пад'ездзе, а пасля гаворкі з суседзямі высветлілася, што жанчыну шмат часу ніхто не бачыў. І вось тут ужо на свой страх і рызыку кіраўніцтва ЖЭУ вырашыла адчыніць кватэру разам са спецыялістамі РУУС і РАНС. Дзвярны замок быў заблакіраваны, і спецыялісты трапілі ў кватэру праз пераходны люк суседняга балкона.

Але ж і ў такім выпадку ніякая служба не мае права адчыняць чужую кватэру — прычынай можа стаць толькі пагроза злачынства. Па заканадаўстве, супрацоўнікі ЖЭУ павінны былі перакрыць ваду жыхарам усяго пад'езда і шукаць уласніцу. А на працягу гэтага часу суседзі заставаліся б без паслугі водазабеспячэння. Як адзначылі ў адміністрацыі, уласніца кватэры яшчэ ў лютым мінулага года асабіста атрымлівала паштовае адпраўленне ад камісіі па каардынацыі работ па садзейнічанні занятасці насельніцтва, а вось калі яна памерла, высветліць ужо следства.

— Хто тут недапрацаваў, цяжка сказаць адназначна. Калі чалавек пэўны час не плаціць за паслугі, то прадстаўнікі камунальных службаў іх адключаюць. На жаль, у такіх дамах, як на Пляханава, запорная арматура знаходзіцца ў кватэры, а гэта значыць, што адключыць газ і ваду можна толькі трапіўшы туды. Доступу ў памяшканне не было, як і прыбораў уліку на гэтыя віды паслуг, таму жанчыне адключылі толькі святло. Няправільна ў гэтым выпадку вінаваціць ЖЭУ, водаканал ці прадстаўнікоў Мінгаза. У гэтых службаў іншыя функцыі — яны абслугоўваюць жылы фонд і аказваюць паслугі, — лічыць Мікалай Мікалаевіч. — Тое ж самае датычыцца і ЖРЭА — яны могуць толькі дапамагчы спагнаць запазычанасць, яны не займаюцца адчужэннем маёмасці. На мой погляд, АРДЦ цяпер неправамерна пераносіць адказнасць на іншыя службы. Але сказаць, што яны нічога не рабілі, я не магу. Кожная служба зрабіла ўсё неабходнае.

І калі ЖЭУ і пастаўшчыкам паслуг дастаткова іх паўнамоцтваў і яны выканалі ў гэтым выпадку ўсе свае непасрэдныя абавязкі, то пэўныя праблемы ў рабоце з даўжнікамі ўсё ж заслугоўваюць увагі кампетэнтных органаў.

— Хутчэй за ўсё такое здарылася, таму што ніхто не меў права адчыніць кватэру з-за таго, што ўласніца не плаціла за паслугі. Зразумела, што праз гэта ламаецца ў жыллё да чалавека таксама памылкова, бо прычыны, што ён не плаціць, могуць быць розныя. Магло б аказацца, што чалавек паехаў адпачываць. Так, сённяшняя сістэма дакладна пабудавана, але чамусьці мы вельмі мякка адносімся да даўжнікоў паслуг — чалавек не плаціць год, а мы ўгаворваем яго гэта зрабіць. Можа, трэба ў такіх выпадках дзейнічаць больш жорстка? — лічыць Мікалай Строк. — Больш уважлівыя павінны быць і ўласнікі. У каментарыях СМІ ўсё выглядае даволі аднабока — суседзі вінавацяць розныя службы, аднак ніхто не задумваецца, што ў гэтых службаў зусім іншыя функцыі. Ніхто са спецыялістаў не можа і не павінен ведаць, хто жыве ў кватэры. У доме на Пляханава суседзі ведалі, што ў жанчыны не было сваякоў, што ў яе былі схільнасці да пэўнага спосабу жыцця, які мог прывесці да такой трагедыі. Трэба разумець, што мы жывём не ў кватэры, а ў доме. І калі вы бачыце, што вашага суседа даўно няма, звярніцеся ў РДЦ, спытайце, ці ёсць запазычанасць, звярніцеся ў РУУС ці ў раённую адміністрацыю, ніхто не адмовіцца дапамагчы.

У сваю чаргу, у ГУУС Мінгарвыканкама адзначылі, што людзі заўсёды могуць звярнуцца да супрацоўнікаў міліцыі, калі даўно не бачылі свайго суседа.

— Гэта не абавязкова павінны быць сваякі. Любы чалавек у любы час можа звярнуцца да нас на нумар 102 ці да свайго ўчастковага інспектара, каб паведаміць пра тое, што даўно не бачыў свайго суседа, што ёсць прычыны для турботы, — тлумачыць **начальнік аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, капітан міліцыі Наталля ГАНУСЕВІЧ.** — Здараецца, што ўчастковага інспектара не заўсёды атрымліваецца знайсці на месцы з-за характару работы, таму ў Мінску не так даўно з'явілася наваўвядзенне — кожны чацвер (з 17.00 да 20.00) у пункце аховы парадку інспектар прымае ад грамадзян адозвы.

## ШТО КАЖУЦЬ ЭКСПЕРТЫ?

У краінах ЕС і Кітаі такія пытанні вырашаюць зусім інакш — аб'яднанне ўласнікаў можа вымусіць даўжніка прадаць сваю кватэру ўжо пасля таго, як ён ігнарue аплату больш за два месяцы. Там не існуе РДЦ (усе разлікі агульных расходаў для кожнага дома робіць менеджар-кіраўнік на год уперад), а пастаўшчыкі для асобных уласнікаў могуць спыніць аказанне паслуг кропкава, не заходзячы ў кватэру (у сучасных дамах прыборы ўліку радыёчастотныя, з электрамагнітнымі клапанамі). **Член праўлення Міжнароднай асацыяцыі менеджменту нерухомасці Генадзь КАЛЁНАЎ** адзначае, што, нягледзячы на гэта, там таксама раптоўна паміраюць адзінокія людзі, у якіх няма сваякоў. Напрыклад, у Аўстрыі і Германіі сярэдняя колькасць жыхароў у кватэры набліжаецца да лічбы «адзін».

— Няплата за паслугі не з'яўляецца індыкатарам трывогі — чалавек можа даручыць банку спісваць кожны месяц грошы са свайго пенсійнага рахунку на карысць аб'яднання ўласнікаў, і аплата будзе ажыццяўляцца. Для выключэння падобных выпадкаў і ў сувязі са старэннем насельніцтва ў Еўропе выкарыстоўваюць зусім іншыя практыкі. Напрыклад, многія жыллёвыя кампаніі прапаноўваюць людзям сталага ўзросту такую паслугу, як «хатні доктар». Дзякуючы датчыку на іх руцэ і прамому каналу з урачом забяспечваецца кругласутачны маніторынг пульсу і асноўных жыццёвых паказчыкаў, — тлумачыць Генадзь Генадзевіч. — Прадухіліць выпадак, які адбыўся ў Мінску, ні камунальныя службы, ні супрацоўнікі РДЦ ніяк не маглі — гэта не сацыяльныя службы, і перад імі стаяць зусім іншыя задачы. Што датычыцца суседзяў, то яны могуць засцерагчы сябе ад небяспекі толькі праз комплекснае страхаванне сваёй маёмасці і ўстаноўку датчыкаў, апавяшчальнікаў. Трэба памятаць, што яны жывуць у шматкватэрным доме, а не ў кватэры, якая ў прынцыпе не можа існаваць асобна ад дома.

## НЕАБХОДНАСЦЬ У САМАСТОЙНАСЦІ

Так, на сёння ні ЖЭУ, ні пастаўшчыкі паслуг не маюць права адчыняць кватэры, калі чалавек ігнаруе аплату нават на працягу некалькіх гадоў. Аднак у сакавіку цікавы выпадак здарыўся на сталічнай вуліцы Альшэўскага ў доме нумар 77 — жыхарам другога пад'езда адключылі газ... з-за даўжніка?

— Амаль тры гадзіны ў нашым пад'ездзе не было газу, а падчас адключэння ў некаторых жыхароў ён якраз працаваў, і адсутнасць падачы яны заўважылі не адразу. Калі мы патэлефанавалі ў Мінгаз, то там зусім не здзівіліся — спецыялісты адключылі ўвесь стаяк, каб такім чынам абмежаваць доступ да паслугі нашаму суседу, — абураецца ўласніца адной з кватэр. — Мала таго што нас пазбавілі паслугі, за якую мы плацім, нас пра яе адсутнасць ніхто нават не папярэдзіў!

Як высветлілася потым, адзін з жыхароў дома патэлефанаваў у газавую службу, бо адчуў пах газу ў пад'ездзе. Спецыялісты даведаліся, што адна з кватэр была загазавана, аднак атрымаць доступ туды ўдалося толькі праз дзве гадзіны.

— Каб прадухіліць аварыйную сітуацыю, нам нічога не заставалася, як адключыць газ у дзевяці кватэрах па стаяку. Мы вывесілі аб'яву, што паслуга будзе адсутнічаць, але, магчыма, яе заўважылі не ўсе. Як высветлілася, жыхар кватэры выкарыстоўваў няспраўную газавую пліту, адсюль і пах газу ў пад'ездзе, — адзначылі ў Мінгазе. — Мы ж нагадваем, што скарочаны нумар 104 дзейнічае па ўсёй краіне, і калі вы адчулі пах газу, неабходна адразу патэлефанаваць менавіта туды. Ні ў якім разе нельга курыць і распальваць агонь. Калі гэта адбываецца ў памяшканні, трэба адразу перакрыць газавае абсталяванне, адчыніць вокны, не ўключаць электрычныя прыборы і выйсці з памяшкання.

І вось тут вельмі важна адзначыць, што калі вада можа толькі сапсаваць рамонт, то ў выпадку з газам жыхароў могуць чакаць больш сумныя вынікі. Да трагедыі мог прывесці і выпадак на вуліцы Пляханава, але ў спецыялістаў папросту не было магчымасці адключыць паслугу — заканадаўства не дае гэтага зрабіць. Хто ведае, што магло б здарыцца, калі б Мінскводаканал адключыў жанчыне ваду, а супрацоўнікі ЖЭУ зрабілі б усё ў рамках заканадаўства — перакрылі стаяк і пачалі б шукаць уласніцу... Спрачацца, разважаць наконт гэтага і вінаваціць розныя службы можна колькі заўгодна, але дакладна зразумела адно: сёння ў групе рызыкі застаюцца не толькі адзінокія людзі, але і іншыя ўласнікі, якія своечасова плацяць за паслугі.

**Валерыя КІСЛАЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Тэлесеткі

# СПЯВАЮЦЬ УСЕ!

**Прынамсі, такое адчуванне складваецца ў прадзюсараў вакальнага шоу X-Factor, якія праводзяць перадкастынгі ў абласных цэнтрах. У мінулыя выхадныя ў Магілёве свой спеўны талент прадэманстравала больш як 200 чалавек ва ўзросце ад 16 да 75 гадоў — ад школьнікаў да пенсіянераў. Многія, дарэчы, выконвалі песні ўласнага сачынення.**





Творчая група праекта ацэньвала не толькі артыстызм і вакальныя здольнасці ўдзельнікаў, але і распытвала іх пра захапленні, сямейныя стасункі, цікавыя моманты ў біяграфіі. І даведаліся многа цікавых жыццёвых гісторый, якія, што называецца, нарочна не прыдумаеш. Самыя яркія абавязкова трапяць у дзённікі тэлепраекта, а пакуль што папярэднія адборы працягваюцца.

У гэтыя суботу і нядзелю прэтэндэнтам прызначаюць сустрэчу ў Гомелі. На сцэне абласнога грамадска-культурнага цэнтра (вуліца Лангэ, 17) патэнцыйныя ўдзельнікі X-Factor змогуць паказаць сябе і спытаць прафесійнай парады ў прадзюсараў Белтэлерадыёкампаніі Глеба Шульмана, Вольгі Шлягер, кіраўніка ранішняй праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!» Алены Воляк, тэлевядучай Святланы Бароўскай, спявачкі і кампазітара Ніны Багданавай.

Агулам на электронную пошту і праз сацыяльныя сеткі Белтэлерадыёкампаніі арганізатары праекта атрымалі ўжо звыш трох тысяч заявак. Дадаць сюды сваё імя можа кожны: калі не атрымліваецца сустрэцца з камандай праекта асабіста, трэба да завяршэння кастынгаў (а яны працягнуцца да пачатку мая) запісаць на відэа сваё выступленне і даслаць яго праз Viber на нумар +375-29-105-91-02 ці ў афіцыйныя акаўнты ў Instagram (instagram.com/xfactorbelarus) і «УКантакце» (vk.com/xfactor_belarus).

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

**Фота прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі.**

## ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 110

З лістоў чытачоў: В. Ваўчкоў з Маладзечна піша, што шашкамі захапіўся ў 70-х гадах, калі чытаў шашачныя аддзелы, рэдагаваныя М. Грушэўскім. Раней браў удзел у завочных спаборніцтвах (гульні па паштовай перапісцы), і ў цяперашні час, не зважаючы на праблемы са зрокам, з задавальненнем разбірае кожную публікацыю аб шашках. У. Панько піша, што яму падабаецца творчасць шашачнага кампазітара Генадзя Андрэева з Рыгі, кампазіцыі якога мы публікавалі ў папярэдніх аддзелах. Наш чытач адзначае, што кампазіцыі Андрэева не заўсёды вылучаюцца складанасцю і загадкавасцю, аднак ім уласцівы прыгажосць і арыгінальнасць. Сёння прапануем знайсці шлях да перамогі ў кампазіцыях яшчэ аднаго прыбалтыйскага складальніка — Рымаса Мацкявічуса з Вільнюса. Спадзяёмся, што і ў гэтых творах чытачы знойдуць шмат цікавага і павучальнага.

№ 27



№ 27

**Белыя простыя шашкі:** d2, f4, g5, f6, c7, g7 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** f2, e3, b4, h4, c5 (5)

№ 28

**Белыя простыя шашкі:** f4, a5, g5, f6, c7, e7 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** d2, f2, e3, h4, c5, a7, d8 (7)

№ 29

**Белыя простыя шашкі:** 11, 12, 13, 17, 18, 19, 31 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** 6, 10, 20, 21, 26, 38, 41 (7)

№ 30

**Белыя простыя шашкі:** 6, 11, 14, 18, 22, 38, 44 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** 1, 21, 30, 31, 35, 40, 41 (7)

№ 31

**Белыя простыя шашкі:** e1, f2, c3, e5, g5, f6, c7 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** h2, a3, g3, h4, c5, d8 (6)

Апошняя кампазіцыя складзеная па правілах бразільскіх шашак.

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 109 ад 13.03.20.

№ 24 1. f4-g5 h6:f4 2. c7-b8 a5:e5 3. b8-d6 e5:c7 4 .a7-b8 c3:a5 5. b8:h8 +

№ 25 1. c7-d8 a5:c7 2. d8:g1 c3:a5

[2...e5:c7 3. b8:h2 c3:a4 4. h2-g3 h4:f2 5. g1:c1 a5-b4]

3 .g1-e3 e5:c7 4. b8:h2 d2:f4 5. h2:d6 +

№ 26 1. f6-e7 h8:d8 2. a7-b8 h4:f6 3. b6-a7 d8:b6 4. a7:g1 e5:c7 5. b8:g7 g3:e5 6. g7:d4 c3:e5 7. a1:e1

Першыя дакладныя адказы даслалі У. Бандарык (Мінскі раён), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі (Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**



Сядзі і глядзі

# АД КЛАСІКІ ДА СУЧАСНАСЦІ

**Культура — адзін з кодаў, па якіх можна давядацца пра народ і яго месца ў свеце і на розных этапах развіцця. Яна знаходзіць сваё адлюстраванне ў пэўных жанрах і кірунках мастацтва — літаратуры, кіно, тэатры... І цяпер, калі ўсіх заклікаюць часцей заставацца дома, мы падказваем, дзе ўбачыць «Жывую культуру», калі пераглядзець «Дзікае паляванне караля Стаха» і як упісаць сваё імя ў кантэкст сучаснай драматургіі.**

Сёння, у Міжнародны дзень тэатра, пачынаецца прыём работ на радыёконкурс сучаснай п'есы «Беларускі радыётэатр 2.0», які абвясціла радыё «Культура». У ім могуць узяць удзел усе, хто жадае дзяліцца сваімі поглядамі і думкамі адносна таго, чым жывуць сёння людзі. Творчае спаборніцтва прысвечана 95-годдзю Беларускага радыё і ладзіцца дзеля пошуку таленавітых аўтараў, добру актуальнага драматургічнага матэрыялу з яго далейшай пастаноўкай у эфіры. Удзельнікам прапануюць выказацца па тэмах: «Сучасная беларуская культура і нацыянальныя традыцыі», «Чалавек у глабальным свеце», «Сучасная асоба і радыё», «Гарманічныя адносіны чалавека з прыродай».

— У мяне зараз такое адчуванне, што ёсць глеба для з'яўлення новых аўтараў. І вельмі спадзяюся, што пашырыцца геаграфія і пабольшыцца колькасць удзельнікаў у параўнанні з першым конкурсам. Галоўнае, каб мы падтрымлівалі традыцыі, якія былі ў нас на радыё калісьці. Што адбываецца цяпер у тэатры: ідуць пошукі новых аўтараў і сцэнарыяў. Хочацца, каб тое ж было і ў нас на радыё, каб радыётэатр атрымаў новы творчы імпульс і знайшоў новыя тэмы, актуальныя і цікавыя для сучаснага слухача, — кажа **аўтар і каардынатар праекта Уладзімір ТРАПЯНОК.**



Фота Белтэлерадыёкампаніі.

Даслаць п'есы ўсе ахвотныя змогуць на адрас канала «Культура» да канца верасня. Пераможцу вызначыць журы да 10 лістапада, а найлепшы твор будзе пастаўлены ў 2021 годзе. Палажэнне радыёконкурсу, форма заяўкі на ўдзел і кантакты арганізатараў змешчаны на сайце www.radiokultura.by.

28 сакавіка тэлеканал «Беларусь 3» прапануе сваёй аўдыторыі пяцідзясяты выпуск праграмы «Жывая культура», у якім можна будзе здзейсніць вандроўку па гарадах Віцебскай вобласці і даведацца пра адзін з элементаў Дзяржаўнага спіса нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі — традыцыю спіральнага саломапляцення. Яна захавалася сёння ў Гарадоцкім, Браслаўскім і Верхнядзвінскім раёнах і ў самім абласным цэнтры.

Здымачная група праекта пазнаёмілася з рамеснікамі клуба пры Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры, завітала ў Гарадоцкі Дом рамёстваў і фальклору і да віцебскіх майстроў культурна-гістарычнага комплексу «Залатое кольца горада Віцебска «Дзвіна». Менавіта дзякуючы іх дзейнасці самабытная тэхніка спіральнага пляцення застаецца запатрабаванай, а ў студзені атрымала статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь. Спіральнае пляценне лічыцца адной з самых старажытных тэхнік і мае як побытавае, так і дэкаратыўнае прызначэнне. Майстры, дзякуючы якім гэты від народнага мастацтва захаваўся да нашых дзён, як некалі нашыя продкі, вырабляюць з саломы самыя розныя прылады — ад кошыкаў і куфараў да капелюшоў і абутку.

Таксама сацыякультурны тэлеканал запрашае на прагляд стужкі «Дзікае паляванне караля Стаха». Фільм Валерыя Рубінчыка, зняты паводле аповесці Уладзіміра Караткевіча, дасць гледачам магчымасць пранікнуцца атмасферай мінулага, пазнаёміцца з яго таямніцамі і героямі. Карціна, якая была ўпершыню прэзентавана на экране 40 гадоў таму і здабыла шэраг узнагарод у розных краінах, чакае прыхільнікаў беларускай літаратуры на кінасеанс у нядзелю 5 красавіка.

**Алена ДРАПКО.**


**«Смачны надвячорак са «Звяздой!»**

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на ІІ квартал або І паўгоддзе 2020 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 13 красавіка ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013.

**Сярод падпісчыкаў 17 красавіка 2020 года будуць разыграны 7 тэрмасаў з лагатыпам «Звязда» і суперпрыз — грыль-барбекю Sundays Allan.** Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 27 красавіка 2020 года.

Прызы можна атрымаць у рэдакцыі да 30 чэрвеня 2020 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на ІІ квартал або І паўгоддзе 2020 года і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Смачны надвячорак са «Звяздой» чытайце ў нумары 49 газеты «Звязда» ад 12.03.2020 г.



**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**

Тэрмін праўдзення гульні — з 14.03.2020 г. да 30.06.2020 г.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3758 ад 06.03.2020 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на ІІ квартал або І паўгоддзе 2020 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____

Падпіска аформлена і аплачана ў ____
(аддзяленне сувязі)
на ІІ квартал або І паўгоддзе 2020 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) ____ (індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

6.25 Слова мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Уваходу Гасподняга ў Іерусалім.
6.35 Меладрама «Новы муж» (12+).
8.15 Клуб рэдактараў (16+).
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал» (12+).
9.50 Гісторыі выратавання (12+).
10.30 Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
11.10 Вакол планеты.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Меладрама «Тры ў адным-3» (16+).**
13.30 «Я ведаю» (6+).
15.15 Твой горад.
15.30 Маршрут пабудаваны (12+).
**16.10 Меладрама «Помста як лекі». 1-я і 2-я серыі (16+).**
19.45 «На вылет!» (12+)
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
**22.10 Меладрама «Год сабакі». 1—4-я серыі (16+).**

## Беларусь 2

**7.00 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
8.30 М/с «Цімон і Пумба» (0+).
9.15, 19.35 Тэлебарометр.
9.20 «Вежа» (12+).
10.10 «Шэрлакі» (16+).
11.00 «Да пабачэння» (16+).
11.50 «Свет навыварат. Бразілія» (16+).
12.45 Экшн «Першы мсціўца: іншая вайна» (12+).
14.55 «Вячэра не патрэбна» (16+).
15.40 «Тата папаў» (16+).
**17.25 Драма «Гульні розуму» (12+).**
20.10 «Чалавек-невідзімка» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.15 Камедыя «Тэлевядучы: легенда аб Роне Бургундзі» (12+).**
22.45 «Суперзжонка» (16+).
23.35 «Трэці лішні» (16+) [СЦ].

## Беларусь 3

7.35 «Святыні Беларусі».
8.00, 10.15 Навіны культуры.
8.20, 20.35 «Гэты дзень».
**8.25 «Дзяўчына без адраса». Маст. фільм (12+).**
10.00 «Наперад у мінулае».
10.25 «Беларуская кухня». Запяканка рыбная.
10.50 «Нацыянальны хіт-парад».
**11.45 «Прададзены смех». Маст. фільм (6+).**
14.00 «Апошні дзень». Наталля Гундарава (12+).
14.55 «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
**15.35 «Мініно». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
17.10 «Дыскатэка СССР». «Нас не догоняць». Канцэрт.
**18.00 «Дзікае паляванне караля Стаха». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Праверка на дарогах». Маст. фільм (12+).**
22.40 «Камертон». Валерыя Арланава.
23.05 «Тэатр у дэталях». Спектакль Тэатра-студыі кінаакцёра «Безыменная зорка».
23.30 «Архітэктура Беларусі».

## Беларусь 5

6.55 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 3-і тур. «Шахцёр» (Салігорск) — «Нёман» (Гродна).
8.40 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 3-і тур. БАТЭ (Барысаў) — «Рух» (Брэст).
10.30 Вось гэта спорт!
10.40 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 3-і тур. «Дынама» (Брэст) — «Славія» (Мазыр).
12.30, 12.55 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Фінал.
15.15 Вялікі спорт.
15.55 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 3-і тур. ФК «Віцебск» — ФК «Смалявічы». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
17.55 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 3-і тур. «Іслач» (Мінскі р-н) — ФК «Слуцк». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
19.55 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
20.40 Піт-стоп.
21.10 Вынікі тыдня.
21.55 Фактар сілы.
22.25 Бокс. Сусветная суперсерыя.

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 [СЦ] Нашы навіны.
7.10 «Здароўе» (16+).
8.05 «Жыццё іншых» (12+).
9.10 «Нядзельная прапаведзь».
9.25 «Метэагід».
**9.45 Камедыя «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка» (6+).**
11.25 «Бачылі відза?» (6+)
**12.10 Серыял «Касіркі» (16+).**
15.35, 16.20 Вялікі новы канцэрт Максіма Галкіна (12+).
18.25 «Лепш за ўсіх!» (6+)
20.00 «Контуры».
**21.20 Маст. фільм «Райскі куток» (16+).**
23.10 «Спартклуб» (16+).
23.30 «Што? Дзе? Калі?» Вясновая серыя гульняў (16+).
0.40 «Пра каханне» (16+).

## СТБ

**10.15** Дзяўчаты бываюць розныя (16+).
**11.55** Вайна полаў (16+).
**13.30, 19.00** Масгаз (16+).
**15.40** Джунглі (12+).
**17.10** Хачу ў турму (12+).
**21.00, 5.30** Уцёкі (16+).
**23.10** У руху (16+).
**0.55** Кандагар (16+).
**3.00** Экіпаж (6+).

## National Geographic

**6.00** Рабі стаўкі і ўзрывай (16+).
**6.25** Асушыць акіян (16+).
**7.15, 10.25** Найбуйнейшы ў свеце рамонт (16+).
**8.05** Золата Юкана (16+).
**8.50** Мегаполісы (16+).
**9.40** Дзікі тунец (16+).
**12.00, 1.55** Аўта-SOS (16+).
**13.35** Схаваныя жамчужыны Турцыі (16+).
**14.20** Інстынкт выжывання (16+).
**15.05, 21.20, 2.45, 4.25** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**16.40** Мяжа (16+).
**17.25** Секунды да катастрофы (16+).
**18.15, 22.05, 1.10, 3.35** Злавіць кантрабандыста (16+).
**19.45** Тайныя гісторыі (16+).
**20.35** Сведкі катастроф (16+).
**22.50** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**23.40** Гарачыя межы: Лацінская Амерыка (16+).
**5.15** Зборнік «Гульняў розуму» (16+).

## Discovery

**8.00, 3.30** Дальнабойшчык у Амерыцы (12+).
**8.50, 15.45, 22.10** Махінатары (12+).
**9.40** Зроблена з другаснай сыравіны (12+).
**10.30, 17.35, 2.40** У пагоні за класікай (12+).
**11.20, 23.05** Стальныя хлопцы (12+).
**12.15, 1.50, 6.30** Голыя і напалоханыя (16+).
**13.05** НАСА: невытлумачальныя матэрыялы (12+).
**14.00** Забытая інжынерыя (12+).
**14.50** Стадыён (12+).
**16.40** Як гэта ўстроена: аўтамабілі мары (12+).
**17.05, 21.05** Як гэта зроблена? (12+)
**18.30, 4.15** Гаражнае золата (12+).
**19.25** Залатая ліхаманка (16+).
**5.00** Як працуюць машыны (12+).
**5.45** Рыбалка голымі рукамі (12+).
**7.15** Дальнабойшчык у В'етнаме (12+).

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 14 апреля 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

| Предмет торгов |
|---|
| «Административное помещение 23» общей площадью 33,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786227, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-23; «административное помещение» общей площадью 39,3 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786228, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-24; «административное помещение 25» общей площадью 32,4 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786229, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-25; «административное помещение 26» общей площадью 58,1 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786230, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-26; «административное помещение 27» общей площадью 38,1 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786231, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-27; «административное помещение 28» общей площадью 38,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786232, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-28; «административное помещение 29» общей площадью 37,4 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786233, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-29; «административное помещение 30» общей площадью 17,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786234, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-30; «административное помещение» общей площадью 156,4 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-708129710, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-31; «административное помещение 37» общей площадью 16,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786241, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-37; «административное помещение 38» общей площадью 17,3 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786242, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-38; «административное помещение 39» общей площадью 15,5 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786243, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-39; «административное помещение 40» общей площадью 16,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786244, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-40; «серверная, подсобное помещение» общей площадью 33,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786245, расположенное по адресу: г.Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-41; «административное помещение» общей площадью 64,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-708129713, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-43; «административное помещение» общей площадью 16,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-708129714, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-43а; «административное помещение 44» общей площадью 14,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786248, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-44; «комната приема пищи» общей площадью 5,5 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786249, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-45; «административное помещение» общей площадью 6,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-708129715, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-48; «административное помещение» общей площадью 15,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-708129716, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-49; «административное помещение» общей площадью 42,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-708129717, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-50 |
| Начальная цена: 1 077 500,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 100 000,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **14 апреля 2020 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 26.03.2020 по 10.04.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»)**

# «ГЛЯДЖУ Ў АКНО, КАБ ХОЦЬ ХТО ПРАЙШОЎ»

## Як жывуць цяперашнія вяскоўцы ў колішняй сядзібе Элізы Ажэшкі

**Людвінова — вёска асаблівая, з надзвычай цікавай гісторыяй. Даўно збіралася сюды заехаць, з той пары, як прачытала ў кнізе Анатоля Федарука «Старадаўнія сядзібы Берасцейшчыны», што з пераездам Элізы Ажэшкі Людвінова стала цэнтрам інтэлектуальнага жыцця ваколіцы. Юная гаспадыня маёнтка збірала вакол сябе не толькі багатую бібліятэку, але і перадавую шляхту з суседніх маёнткаў. У 1862 годзе яна арганізавала пачатковую школу для вясковых дзяцей.**



Староста вёскі Марыя ПРАТАСЕВІЧ, Ганна АРЦЮХЕВІЧ, Ніна РЭПІХА, Вера ЦЕЛЯШУК.

### РЫТАРЫЧНАЕ ПЫТАННЕ

Цяпер, на жаль, ад былога маёнтка нічога не засталося. Некалькі векавых дрэў старадаўняга парка нагадваюць пра тыя часы. Тут будучая пісьменніца ладзіла не толькі балі і сустрэчы: падчас паўстання 1863 года ратавала параненага Рамуальда Траўгута, тут яны разам з суседкай Стэфаніяй Жук і іншымі шляхцянкамі ладзілі шпіталь для паўстанцаў, збіралі для іх адзенне і правіянт. Пасля паражэння паўстання, арыштаў, ссылак і канфіскацыі маёнтак пераходзіў з рук у рукі, цярпеў паступовы заняпад. Цяпер на месцы сядзібы ўстаноўлены памятны валун з мемарыяльнай дошкай, на якой пазначана, што Эліза Ажэшка жыла тут з 1858 да 1864 года.



Валун на месцы былога сядзібнага дома.

Сёння ў Людвінове 57 жыхароў, абсалютная большасць з якіх — пенсіянеры. Камандзіроўка адбылася праз тры дні пасля жаночага дня. Звярнула ўвагу, што ва ўсіх бабулек стаялі ў вазах цюльпаны. Гэта значыць, што дзеці клапоцяцца, наведваюць, аберагаюць сваіх састарэлых матуль. Але тыя, як і многія іх равесніцы, не спяшаюцца ў гарадскія кватэры дзяцей — ім лепей у родных сценах, дзе прайшла маладосць, дзе жылі, гадавалі сыноў і дачок, працавалі, радаваліся, гаравалі.

— Як раней працавалі на палях з цямна да цямна, — разважае 85-гадовая Марыя Клімовіч, — так ужо не працуюць у калгасах. Цяпер трактары, машыны ўсё робяць, паляводаў больш няма. А ў мяне ў звяне было 30 жанчын, лён убіралі, буракі палолі, бульбу капалі. Работа цяжкая, усё рукамі ды спіну гнуць, а яшчэ свая гаспадарка ў кожнага немалая — каровы, свінні, куры, уласныя соткі. Але, нарабіўшыся, умелі адпачываць, спявалі часта. У мяне, бывала, у хаце столькі жанчын збярэцца, і пагамонім, і песні пасліваем — ніякіх п'янак тады нават заваду не было. І так жа весела, калі ўсе збяруцца... Школа была, клуб у вёсцы, ферма. А цяпер во сяджу каля акна, усё гляджу, каб хоць хто прайшоў па вуліцы, — сяло апусцела. І чаму гэтых людзей няма?

Марыя Аляксандраўна і сама ведае адказ на сваё рытарычнае пытанне. Бо не засталіся ў вёсцы яе дзеці, дзеці суседзяў, дзеці яе таварышак па льнаводчым звяне. У яе, напрыклад, і сын, і дачка скончылі Горацкую акадэмію, атрымалі эканамічную адукацыю, знайшлі работу ў большых населеных пунктах. Унукі вывучыліся на дактароў, аселі ў абласным цэнтры. Так і іншыя дзеці пайшлі ў свет — вось і пусцее Людвінова. Суседка хіба зойдзе да Марыі — Пелагея Крыўнюк. Пелагея Ігнатаўна на свае 97 гадоў не выглядае. Не без гонару сказала, што сама сябе даглядае, нават уласны агарод трымае. Яна не проста багатая бабуля, а супербагатая: яе з 8 Сакавіка ўжо прапраўнук павіншаваў. Праўда, гэтую місію выканаў бацька самага меншага прадстаўніка сям'і з прычыны яго малалецтва. Але ж сам факт, што Пелагея Ігнатаўна не проста дачакалася вяселля праўнука, але змагла патрымаць на руках яго сына, вельмі важнага для бабулі. Яна і не супраць сабраць на сваім стагадовым юбілеі ўсю вялікую сям'ю — можа, да той пары прапраўнукаў стане больш.

### ХУТКА 70 ГАДОЎ РАЗАМ

Са старшынёй Папінскага сельскага Савета Святланай Дышко зазіраем да Ніны і Васіля Рэпіхаў — Ніна Рыгораўна, у адрозненне ад сваіх суседак, жыве не адна, а з мужам Васілём Аляксандравічам. Праўда, былы калгасны механізатар, кавалер ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцяга і Кастрычніцкай Рэвалюцыі цяжка хварэе, самастойна не ходзіць пасля перажытага інсульту. Цяпер Ніна Рыгораўна — галоўная падтрымка і апора для мужа.

Яна добра помніць гады акупацыі — колькі перажылі, колькі нацярпеліся ў вайну:

— Бацьку забілі як актывіста. А мы з мамай, у якой тры дачкі былі на руках, сталі ўцякаць, шукаць партызан. Людзі падказалі, што нам заставацца дома небяспечна, вось і пабеглі, схапіўшы вузельчык рэчаў. З вялікай цяжкасцю знайшлі партызанскі атрад, уладкаваліся ў сямейны лагер. Мама мыла бялізну для партызан, мы ёй дапамагалі. Мяне як меншую бралі з сабой у разведку — дарослы чалавек з дзіцем выклікаў меней пытанняў на дарозе. Вось так і перажылі вайну. Пасля вызвалення вярнуліся ў сваю хату — і не пазналі. Так было разрабавана, ні міскі, ні лапіка ніякага не засталося, нават шпалеры са сцен былі садраныя. Знайшліся толькі маміны любімыя фікусы — аказалася, іх немцы сабе ва ўправу забралі. Што было есці, з чаго жыць, невядома. Тады маме нехта падказаў, што можна зарабіць у людзей на хутарах. Да іх мы і наймаліся на работу, жалі жыта, капалі бульбу. Зарабілі і пшаніцы, і бульбы, і агародніны. Так перажылі першую зіму. Потым маці ўладкавалася на работу ў дзіцячы садок у Драгічыне. Сёстры старэйшыя таксама падаліся ў горад, а я, 13—14-гадовая, заставалася дома, у школу хадзіла. У нас у тую пару ўжо кароўка была і парася, дык я іх даглядала. Малака за тыдзень назбіраю, вяршкоў, а яны прыедуць у выхадны, ужо масла саб'юць. Вось так і жылі, — расказвае Ніна Рэпіха.

У 1950 годзе зусім маладзенькай выскачыла замуж за мясцовага танцора і веселуна Васіля. «Вельмі прыгожа танцаваў у клубе, лепш за ўсіх», — згадала Ніна Рыгораўна. Гэтым і звярнуў на сябе ўвагу. І ён заўважыў маленькую ростам, але ўвішную танцорку, так і пазнаёміліся, пасябравалі. І вось ужо хутка семдзесят гадоў разам. У калгасе працавалі. «Спачатку за палачкі, потым за грошы, — расказвае гаспадыня дома, — дзяцей гадавалі, унукаў-праўнукаў дачакаліся. Цяпер усё ёсць, пенсія добрая, вось толькі здароўя хацелася б болей».

### СТАРАЯ ГВАРДЫЯ

Суседку ў гэтым гарача падтрымліваюць Ганна Карпаўна Арцюхевіч і Вера Яўгенаўна Целяшук. Жанчыны таксама ў гадах, удовы, але самі спраўляюцца з уласнай хатняй гаспадаркай, па дапамогу сацыяльнага работніка ні адна з іх не звярталася. Як сказала староста вёскі Марыя Пратасевіч: «Мая старая гвардыя фору дасць некаторым маладым. Усё ў іх заўсёды ў парадку, у дамах прыбрана. Вядома, дзеці прыязджаюць, дапамагаюць, але і самі жанчыны не сядзяць склаўшы рукі, стараюцца рухацца, выконваць нескладаную работу, гэтым і жывуць».

Вось толькі аб адным шкадуюць — што іх любімы доктар з Папінскай амбулаторыі Святлана Даўгун пайшла на пенсію: «Яна ўсе нашы хваробы ведала, мы і цяпер прызначаныя ёю лекі прымаем, яе рэкамендацыі выконваем». Але старшыня сельвыканкама Святлана Дышко запэўніла, што і малады спецыяліст, якая нядаўна прыступіла да работы, да сваіх абавязкаў ставіцца адказна і абяцае вырасці ў добрага доктара.

Да амбулаторыі пяць кіламетраў. У самім жа Людвінове з сацыяльных аб'ектаў засталася толькі крама. Яно і не дзіва: калі, скажам, у 1959 годзе тут было амаль 300 жыхароў, у 1995-м значылася 150 чалавек, дык цяпер, як ужо гаварылася, — 57. Але што цікава, мае суразмоўнікі не пагадзіліся стаць героямі рубрыкі «Вёскі, якія знікаюць...» Яны лічаць, што Людвінова будзе жыць. Вунь колькі апошнім часам дамоў купілі для вядзення падсобнай гаспадаркі! Вясной пустыя хаты ажываюць, сезонныя гаспадары садзяць маліны, клубніцы, іншыя ягады. Трапляліся на асобных дамах плакаты са словам «Прадаецца». Што ж, я таксама за тое, каб вялікае некалі Людвінова, вёска ў тры вуліцы, не знікала, а доўга заставалася на карце нашай краіны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Драгічынскі раён.*

# «ГАЛОЎНАЕ, КАБ ДУША БУР'ЯНОМ НЕ ЗАРАСТАЛА...»

**Старэйшына маленькай вёсачкі ў Жлобінскім раёне, дзе жыве менш за тры дзясяткі чалавек, аб'яднала месцічаў і запаліла іх ідэяйператварэння занядбанай некалі мясціны ў прывабнае месца адпачынку ад гарадской мітусні. Галіна ХАДАСОЎСКАЯ сёлета стала пераможцай конкурсу «Жанчына года» Гомельскай вобласці ў намінацыі «Выбар года».**

— За два дні да ўручэння ўзнагароды патэлефанавалі, сказалі быць у райвыканкаме ў пэўны дзень пры поўным парадзе, — згадвае Галіна Хадасоўская. — Нас было пяцёра вылучана са Жлобінскага раёна. Гуртом накіраваліся ў Гомель на ўрачыстае свята. Была вельмі цікавая праграма, дыпломы ў розных намінацыях атрымалі жанчыны з раёнаў. Вось называюць маё прозвішча ў намінацыі «Выбар года». Імя прагучала, імя па бацьку — прыемна, але калі вядучыя са сцэны сказалі — старэйшына маленькай вёсачкі Чарцёж у Жлобінскім раёне, — вось тады сапраўды зашчымела-запякло ў душы, шчыра кажу.

> Кожны навёў парадак на сваім падворку. Цікава, што ў Чарцяжы — што ні сядзіба, то падворак узорнага ўтрымання.

Галіна Леанідаўна кажа, што ў самім раёне цяпер многія не ведаюць нават назвы мясціны Чарцёж, а тут з вялікай сцэны вобласці звярнулі ўвагу на сціплы куток. Пасля ў агульнай групе ў сеціве яна напіша: гэтыя дыплом і перамога не яе, а агульныя, вясковыя.

Шосты год Галіна Леанідаўна тут старэйшына. Працавала раней у Жлобіне, цяпер на пенсіі, пакінула кватэру ў райцэнтры і перабралася ў вёску. Чарцёж — населены пункт Краснабярэжскага сельсавета ўсяго за 14 кіламетраў ад Жлобіна, але наўпрост ад трасы полем ехаць вырашыцца не ўсякі. Большасць дабіраецца да глухой вёсачкі з чыгуначнай станцыі пешшу, а ахвотных прыехаць сюды нямала. У вёсцы 108 падворкаў, стала пражывае 26 чалавек. Астатнія гаспадары — дачнікі: хтосьці купляе дамы для летняга адпачынку, хтосьці даглядае старыя бацькоўскія хаты. Жанчына шкадуе: цяпер губляецца ў цэлым аблічча мясцовых жыхароў, вымірае пакаленне людзей, якія нарадзіліся і жылі тут, прыкіпелі. Яна ж перакананая, што нават такая сітуацыя — не прысуд для вёскі.

Старэйшына згадвае, з чаго пачала сваю работу з мясцовымі: Чарцяжу не пашанцавала с мясцовасцю — нізіны перамяжоўваюцца з пагоркамі. На вясковых могілках, напрыклад, быў велізарны яр, зараснікі бэзу ды лазняк адваёўвалі тэрыторыю.

— Даўно марыла навесці парадак на нашых могілках, але самастойна што зробіш? У сацсетцы стварыла суполку «Чарцяжане», прапанавала сабрацца, скласці ініцыятыўную групу, ідэі падкінула, як навесці парадак на могілках і каля падворкаў.



***На фота:** жыхаркі Жлобінскага раёна, якія былі вылучаны на конкурс «Жанчына года – 2020». Старэйшына вёскі Чарцёж – Галіна ХАДАСОЎСКАЯ – крайняя справа.*

Ініцыятыўная група з шасці аднавяскоўцаў зрушыла справу з месца: арганізоўвалі людзей праз сустрэчы на вуліцы, звароты ў сецівe і па тэлефоне. Чарцяжане аказаліся вельмі спагадныя. Летась пачалі збіраць грошы для добраўпарадкавання, кажа старэйшына. Вядома, грошы грашыма, галоўнае — стаўленне людзей да справы, іх зацікаўленасць. Галіна Хадасоўская запрасіла ў вёску на сустрэчу кіраўніка гаспадаркі з Чырвонага Берага.

— Мы расказалі, што хочам засыпаць вялізны яр, — пясок мелі дзе браць, але трэба было дапамагчы тэхнікай, — расказвае Галіна Леанідаўна. — Усе вельмі ўдзячныя, бо нам гаспадарка выдзеліла трактар «Амкадор» і два МАЗы — мужчына з мясцовых толькі паспяваў сваёй тэхнікай разраўноўваць. Каб падсыпаць тэрыторыю, спатрэбілася 20 машын пяску. Калі людзі бачаць, на што канкрэтна ідуць іх грошы, то, канешне, больш ахвотна дапамагаюць. Мы сабралі 1675 рублёў. На кожную капейку — расходныя дакументы, для справаздачы зрабілі тут жа на тэрыторыі могілак стэнд. Набылі 100 пралётаў плота, яшчэ амаль столькі ж даў сельсавет. Дапамаглі нам таксама прыбраць шмат аварыйных дрэваў.

Назіраючы, як заўзята працуюць вясковыя актывісты, дачнікі таксама ўключыліся ў работу: усталёўвалі і фарбавалі платы, пазбаўляліся ад быльнягу і зараснікў. Падлічылі, што ўвогуле адпрацавала 90 чалавек з 10 гадзін раніцы да пяці вечара амаль без перапынку, — атрымалася 90 чалавека-дзён. Кожны навёў парадак на сваім падворку. Цікава, што ў Чарцяжы што ні сядзіба, то падворак узорнага ўтрымання. Шмат хто з вяскоўцаў атрымаў узнагароду ад улад за добраўпарадкаванне. Мясцовая мастачка Галіна Чаша дапагае аздабляць дамы, брамы, калодзежы. На іх, здаецца, ажываюць выявы казачных герояў, птушак і кветак.

У Чарцяжы няма крамы, ды і з работай аўтакрамы былі праблемы, якія актыўная Галіна Леанідаўна, зрэшты, тут жа вырашыла:

— Раней прыязджала аўтакрама тры разы на тыдзень, потым толькі два. А што такое гэтыя дзве паездкі? Які можа быць хлеб? Я звязалася са Жлобінскім хлебазаводам, і цяпер па суботах да нас ездзіць іх машына. І, акрамя выпечкі, прывозіць і іншае — малако, каўбасу.

Няма тут і клуба, але гэта не перашкаджае месцічам ладзіць святы вёскі, на якія з'язджаюцца тутэйшыя ўраджэнцы, што жывуць цяпер у іншых гарадах і нават краінах. Прыязджаюць у Чарцёж і артысты з райцэнтра.

— Пляцоўкі няма, дык мы проста на дарозе ставім шатры і ладзім канцэрты, — кажа старэйшына. — Гучыць і гімн нашай вёскі. Калі спачатку на такія святы вёскі збіралася з дзясятак чалавек, то апошнім разам прыйшло каля 200. Фатаграфіямі потым доўга абменьваліся ў сецівe.

Цяпер вёска рыхтуе свята на Дзень Перамогі. У Чарцяжы калісьці жылі шэсць франтавікоў, 14 мясцовых жыхароў не вярнуліся з вайны. Таксама пры падтрымцы раённай улады мясцовыя актывісты ўзяліся за грунтоўны гістарычны праект: аднаўляюць звесткі і шукаюць родных рэпрэсаваных у 30-я гады ХХ стагоддзя жыхароў Чарцяжа.

— Гэта балючая тэма для нас, — пачынае Галіна Хадасоўская. — Тут была чыста каталіцкая вёска, мы падымалі спісы Антушоўскага касцёла Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні — ён быў за пяць вёрст ад Краснага Берага. Нашы чарцяжане жылі тут задоўга да першага афіцыйнага згадвання, яшчэ з канца XIX стагоддзя.

Старэйшына кажа, што па перапісе 1897 года тут была карчма, да пачатку ХХ стагоддзя — школа. Калі ўзяць перапіс 1925 года — было 115 домаўладанняў. Потым 109 чалавек рэпрэсавалі. Цяпер ураджэнцы мясцовасці з розных куткоў свету аднаўляюць звесткі аб сваяках. Праз нашу газету таксама хочуць звярнуцца да ўсіх, хто ведае што-небудзь пра сям'ю Анталёвых з Чарцяжа. Ініцыятыву вяскоўцаў падтрымалі ў раёне, дапамагаюць збіраць звесткі. Сваімі сіламі людзі мараць паставіць у Чарцяжы мемарыяльны знак ахвярам рэпрэсій.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота з прыватнага архіва гераіні.**


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Совместного белорусско-австрийского закрытого акционерного общества «Гомельский стеклотарный завод» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве – ИП Яцына И. В. извещает о проведении 15 апреля 2020 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инв. № 350/D-182539** (инв. №101012) **площадью 4 217,5 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **производственное помещение**. Местонахождение: **Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7–4.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002003191** общей площадью **3,5631 га (право аренды, доля в праве 2/5).** Внутризаводская асфальтобетонная площадка 1451 площадью **662,8 кв. м** (инв. № 101007). | **265 140,00** | 13 257,00 | 26 514,00 |

**Продавец:** СЗАО «Гомельский стеклотарный завод», Гомельская обл., Гомельский р-н, р. п. Костюковка, ул. Гомельская, д. 25, ком. 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029)653-92-88 – управляющий в деле о банкротстве ИП Яцына Игорь Валерьевич. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 27 марта 2020 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13 апреля 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов). Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за пять дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником**, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, в срок, согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» Ст.127–129. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 17.01.2020 г. №10 (29124). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

**ОАО «МОСТОСТРОЙ»**

**филиал «Мостоотряд № 58»**

**Предмет торгов: лот** – капитальное строение с инвентарным номером 100/C-86216 (наименование – склад II группы; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, площадью 2 039,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029588 площадью 2,0163 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, 108Г.
*Составные части и принадлежности: забор железобетонный, линия электропередачи, система водопровода*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | 104 793,60 | **Размер задатка, руб.** | 3 120,00 |
| **Продавец** | филиал «Мостоотряд № 58» ОАО «Мостострой», УНП 201028628 | | |
| **Организатор аукциона** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | | |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | | |
| **Условия продажи** | без условий | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты** | в соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Информация о возмещении затрат** | участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона в течение 3-х рабочих дней со дня подписания протокола аукциона | | |

**Аукцион состоится 7 апреля 2020 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, а также иную информацию, можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**

**Последний день приема заявлений – 6 апреля 2020 г. до 17.00.**

*Ранее извещение о продаже имущества ОАО «МОСТОСТРОЙ» филиал «Мостоотряд № 58» опубликовано в газете «Звязда» от 13.02.2020.*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | **ОАО «СМТ № 8»,** г. Минск, ул. Пионерская, 37 |

**Предмет аукциона (одним лотом)**
Месторасположение: **г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, д. 46, 46/1-46/3, 46/5, 46/6**

| Наименование | Об. пл., кв. м | Инвентар. номер |
|---|---|---|
| **Склады** | 1193,9 | 500/С-28335 |
| **Здание административно-бытового корпуса** | 137,2 | 500/С-28334 |
| **Здание многофункциональное** | 4270,2 | 500/С-28468 |
| Составные части и принадлежности: дворовая территория, тротуар, подпорная стенка, бордюр, ограждение, эстакада, отстойник, заборы, ворота, площадки для складирования, подъездного пути грузового крана и для размещения сушильного оборудования | | |
| **Производственный цех** | 1 411,0 | 500/С-28339 |
| **Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель Ж1/К** | 357,3 | 500/С-51092 |
| **Здание котельной** | 65,1 | 500/С-51093 |
| Составные части и принадлежности: труба дымовая | | |
| **Ливневая канализационная сеть (внешнеплощадочная)** | 103,96 п. м | 500/С-1008470 |
| **Ливневая канализационная сеть (внутри-площадочная) с очистным сооружением** | 271,39 п. м | 500/С-1008471 |
| **Внеплощадочная водопроводная сеть** | 158,99 п. м | 500/С-1008467 |
| **Внутриплощадочная водопроводная сеть** | 351,44 п. м | 500/С-1008461 |
| **Хозяйственно-фекальная канализационная внутриплощадочная сеть** | 321,36 п. м | 500/С-1008477 |
| **Тепловая сеть, сеть горячего водоснабжения** | 88,3 и 87,7 п. м | 500/С-1008462 |

**Иное имущество,** входящее в состав лота: сети 0,4 КВ (инв. № 83), блоки гаражные 6,2*3,2 (3 шт. – инв. № 7, 70317, 70318), аспирационные установки (2 шт. – инв. № 238, 239, 80), шлагбаум (инв. № 1147), котлы водогрейные «Минск-1М» (2 шт. – инв. № 793, 794), теплосчетчик ТЭМ-104-1 ДУ 100 (инв. № 795), теплообменник пластичный (инв. № 796), насосы ТР-300/2 (2 шт. – инв. № 797, 798), насос ТРЕ 40-190/2 (инв. № 799), краны подвесные электрические однобал. (6 шт. – инв. № 94, 102, 41185, ГП2Т. – инв. № 101, 109, ГП1Т – инв. № 110); многолетние насаждения (инв. № 760 – 786, 7870, 7881)

**Сведения о земельных участках:**
- пл. **2,4498** га предоставлен на праве общего долевого постоянного пользования (доля: 9569/10000) для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений производ. базы ПМК-1. Ограничения (обременения) прав: водоохранные зоны водных объектов г. Минска, пл. 0,9124 га и 0,4420 га.
- пл. **0,4528** га предоставлен на праве временного долевого пользования (доля 1/2, срок действия по 31.05.2020) для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений (проезд). Ограничения (обременения) прав: водоохранные зоны водных объектов, охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения и канализации

**Начальная цена с НДС 20 % – 4 746 173,41 бел. руб.**
(снижена на 10 %)

**Дополнительная информация:** в состав лота не входит оборудование трансформаторной подстанции ТП-2267 (ТМ 250/10), камеры силового оборудования РП-2267, хозфекальная канализационная внеплощадочная сеть (инв. № 500/С-1008466)

**Обременения**: площади частично сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.02.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 09.04.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 07.04.2020 до 17.00** по указанному адресу.
**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О СНЯТИИ ОБЪЕКТОВ С ТОРГОВ

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона), сообщает о снятии с аукциона, назначенного на **06.04.2020,** недвижимого имущества Пуховичского райпо:

**Лот № 1: административное здание с инв. № 602/С-4431, 213,9 кв. м, в г. Марьина Горка, ул. Гучка, 8.**
**Лот № 2: магазин с инв. № 602/D-30858, 151,2 кв. м, в д. Габриелевка, 15А-2 Шацкий с/с.**
**Лот № 3: магазин с инв. № 602/С-45184, 105,1 кв. м, д. Слобода, ул. Центральная, 15 Ветеревичский с/с.**
Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.03.2020.

МЕСЯЧНІК ЧЫСЦІНІ

# СЕМ ТЫСЯЧ ДРЭЎ І МІЛЬЁН КВЕТАК

## Як магілёўскія дэпутаты разам з камунальнікамі і жыхарамі наводзяць прыгажосць у горадзе

**Не так даўно ў Магілёве адбыўся першы суботнік, у якім актыўна ўдзельнічала кіраўніцтва вобласці і горада, а таксама народныя абраннікі. Прыбіралі смецце, саджалі дрэвы — адным словам, наводзілі парадак ва ўсіх кутках горада.**

— Збіраемся цяпер кожную суботу разам з насельніцтвам рабіць нашы двары і вуліцы чыстымі і прыгожымі, — дзеліцца планамі **старшыня Магілёўскага гарсавета дэпутатаў Максім ГУРЫН.** — Сумесна з адміністрацыямі раёнаў мы стварылі так званыя мабільныя групы, куды акрамя работнікаў адміністрацый і дэпутатаў уваходзяць ратавальнікі, міліцыянеры, прадстаўнікі санслужбы. Штотыднёва робім аб'езд мікразон, асабліва гэта датычыцца прыватнага сектара, дзе вельмі часта сустракаюцца стыхійныя звалкі. Размаўляем з людзьмі, тлумачым, што трэба наводзіць парадак. І прысутнасць пры гэтым людзей у форме ўздзейнічае на жыхароў вельмі пераканаўча. А калі нават гэта не перавыхоўвае, робім прадпісанні, каб парадак усё ж такі быў наведзены. Калі звалкі вялікія, мы гэтыя месцы ўключаем у план будучых суботнікаў і сумесна з камунальнікамі, і зноў-такі, з насельніцтвам прыбіраем. А яшчэ разам з «Магілёўзелянбудам» вызначаем месцы, дзе трэба пасадзіць дрэвы. Гэта як дваравыя тэрыторыі, так і паркі, дзе не прыжыліся пасаджаныя восенню саджанцы.



**Дэпутат гарсавета Павел ЛАРЧАНКА —** адзін з тых актывістаў, якія самі ініцыююць суботнікі ў сваіх мікразонах. Гэтым разам ён з жыхарамі прыватнага сектара пасёлка Грабянёва шчыраваў у раёне 13-й сярэдняй школы і тамтэйшага прыпынку грамадскага транспарту.

— Мяне вельмі добра падтрымлівае ў такіх справах наш вулічкам, намеснік дырэктара школы Алена Шацікава, — расказвае дэпутат. — У школе наогул працуе шмат маіх самых актыўных выбаршчыкаў, яны заўсёды ахвотна падтрымліваюць прапанову навесці парадак на нашай тэрыторыі. Нікога не прымушаем, усё робіцца добраахвотна. Летась, напрыклад, людзі самастойна прыбралі вельмі занядбаны ўчастак — высеклі кустоўе, сабралі шмат смецця. Я пра гэта даведаўся толькі тады, калі яны папрасілі мяне дапамагчы з яго вывазам. Звярнуўся да Пятра Салаўёва — на той час ён быў дэпутатам парламента, а цяпер кіраўнік адміністрацыі Кастрычніцкага раёна, — каб знайсці транспарт і давесці справу да лагічнага завяршэння. «Магілёўзелянбуд» дапамог пасекчы буйныя галіны, а «Спецаўтапрадпрыемства» вывезла ўсё, што людзі сабралі.

Гэтым разам грамадскасць на чале з дэпутатам наводзіла парадак уздоўж дарогі на мяжы прыватнага сектара і шматпавярховай забудовы. А ў найбліжэйшых планах Паўла Ларчанкі і яго выбаршчыкаў — зрабіць алею з туй на тэрыторыі школы.

— Летась мы ўжо пачалі пасадку дрэў каля школы, сёлета збіраемся гэтую справу завяршыць, — удакладняе суразмоўца і дадае, што мінулы год наогул быў багаты на карысныя справы. Жыхары мікрараёна вельмі хацелі, каб у пасёлку нарэшце з'явіўся гульнявы гарадок для дзяцей. Прычым і грошы сабралі, і сваю будаўнічую брыгаду стварылі. Для сваіх жа дзяцей стараліся. Дэпутаты (а на зварот грамадзян адгукнуліся народныя абраннікі ўсіх узроўняў) гэта ацанілі і шмат чым дапамаглі. Прывезлі арэлі, лаўку, зямлю для футбольнага поля, а потым яшчэ і мяч падарылі.

Сёлета веснавыя работы крыху запаволіў каранавірус, дакладней, тыя прафілактычныя захады, якія робяцца па ўсёй краіне. У школе адмянілі вялікі бацькоўскі сход, на якім Павел Ларчанка збіраўся выступіць са зваротам да жыхароў. Трэба, напрыклад, добраўпарадкаваць прыбярэжную паласу каля тутэйшага возера і пасадзіць там дрэвы, каб да новага купальнага сезона было чыста і прыгожа.

Што датычыцца ў цэлым горада, то асноўныя работы па навядзенні парадку вядуцца **прадпрыемствам «Магілёўзелянбуд» пад кіраўніцтвам яго дырэктара — дэпутата гарсавета Пятра АЛЯКСЕЙЧЫКАВА.**

— Жыхары маёй выбарчай акругі, а дакладней вуліц Фаціна, Цярохіна, Злаўстоўскага, праспекта Дзімітрава, неаднаразова выходзілі на прыборку сваіх двароў. Восенню мы разам з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Вольгай Петрашовай і нашымі актыўнымі грамадзянамі саджалі дрэвы на тэрыторыі ЖЭУ № 14 і 18. Летась на сустрэчы з губернатарам, якая праводзілася ў 41-й школе, народ падымаў тыя пытанні, якія цяпер пакрысе вырашаюцца. Звярталі, напрыклад, увагу на пустыр, дзе добра было б зрабіць сквер. Я не супраць. У нас ёсць два гадавальнікі, дзе мы вырошчваем туі, ліпы, рабіны, клёны, бярозы і іншыя пароды дрэў, — так што пасадачны матэрыял знойдзецца. І ў цэлым па горадзе робім шмат пасадак, у тым ліку кампенсацыйных. На нядаўнім гарадскім суботніку ўдзел у іх браў і мэр горада Уладзімір Цумараў.

— Мы плануем высадзіць сёлета ў горадзе сем тысяч дрэў і мільён кветак,— дадае **начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела «Магілёўзелянбуда» Святлана БАНКУЗАВА.** — Вельмі хочацца, каб наш горад быў асабліва прыгожы ў год 75-й гадавіны дня Вялікай Перамогі. Плануем таксама высадзіць каля пяці тысяч кустоў. Часцей за ўсё спраўляемся сваімі сіламі, але бывае, што людзі самі бяруць ініцыятыву ў свае рукі. Летась, напрыклад, мы каля 300 дрэў аддалі актывістам, якія падчас суботнікаў саджалі іх у сябе ў дварах.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота дадзена Магілёўскім гарсаветам дэпутатаў.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 26 сакавіка 2020 года.**